

НЕ СПЯШАЙЦЕСЯ ГЛЫТАЦЬ

4

ЖЫЦЦЁВЫЯ МУДРАСЦІ ЛЕАНІДА ЗАХЛЕЎНАГА



9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 САКАВІКА 2022 г. СУБОТА № 49 (29671)

КОРАТКА

- Новы музейны будынак узвядуць у комплексе «Хатынь».
- **Школу і дзіцячы садок адкрыюць сёлета ў сталічным ЖК «Мінск Мір».**
- Белаграпрамбанк будзе працаваць беспераробойна, нягледзячы на адключэнне ад SWIFT.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Вытрымаем! На злосць ворагам»

Гэтыя словы беларускага Прэзідэнта сталі лейтматывам перагавораў лідараў Беларусі і Расіі ў Маскве

**Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмеркавалі шэраг тэм: рэспубліканскі рэферэндум, санкцыі краін Захаду, іх негатыўны (і не толькі) уплыў на эканоміку Беларусі і Расіі, удзел наёмнікаў у вайне на баку Украіны, яднанне краін — удзельніц АДКБ і ЕАЭС ва ўмовах знешняга ціску.**



Фота БелТА.

На пачатку сустрэчы Уладзімір Пуцін павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з паспяховым правядзеннем рэферэндуму, адзначыў высокую яўку на ўчастках для галасавання і падтрымку грамадзян Беларусі. «Думаю, што гэты палітычны працэс, які вы ініцыявалі, дыялог, які вы ведзяце з людзьмі, надзвычай важны для таго, каб сітуацыя была ўстойлівай і стабільнай. Толькі пры такой сітуацыі можна гаварыць і аб эканамічным развіцці», — перадае словы Прэзідэнта Расіі прэс-служба беларускага лідара.

Да пачатку перагавораў па месенджарах разляцелася чарговае выказванне Аляксандра Лукашэнкі пра санкцыі. «Яшчэ як вытрымаем! На злосць ворагам», — сказаў кіраўнік дзяржавы перад пачаткам перагавораў, адказваючы на пытанне, ці ўдасца Расіі і Беларусі вытрымаць санкцыі.

Пасля ўжо непасрэдна на сустрэчы кіраўнік дзяржавы працягнуў свой тэзіс. «Мы з Вамі ў пастаянным кантакце знаходзімся. Як адчувалі, што часы будуць няпростыя. Але я Вам па тэлефоне неаднойчы казаў: і ***Расійская Федэрацыя, а мы тым больш — заўсёды пад санкцыямі. Сёння яны больш маштабныя, але мы ўжо да гэтага, прабачце мне, свінства Захаду прывыклі***», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сёння санкцыі — гэта яшчэ і час магчымасцяў.

«Я чалавек савецкі, вы з савецкага перыяду добра ведаеце: ***мы заўсёды, калі былі пад санкцыямі, нармальна жылі і развіваліся***. Проста ў сілу існуючай абстаноўкі (нават не з санкцыямі звязана, проста часу мала прайшло) нашы людзі захваляваліся», — акцэнтаваў Прэзідэнт.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй САВІНЫХ, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў:**

*«15 сакавіка набываюць моц змяненні і дапаўненні Канстытуцыі краіны. Каб яе палажэнні былі рэальна дзеючымі, перад заканадаўцамі стаіць сур'ёзная задача правесці сістэмнае і мэтанакіраванае ўдасканаленне нарматыўнай прававой базы. Трэба будзе скарэкціраваць вялікую колькасць законапраектаў, і на гэту работу прадугледжваецца не больш як два гады. Па выніках гэтага тэрміну мы будзем мець новую заканадаўча афармленую палітычную сістэму. Трэба, у прыватнасці, урэгуляваць размеркаванне ўладных паўнамоцтваў Прэзідэнта, парламента, Савета Міністраў у адпаведных заканадаўчых актах. Трэба будзе ўважліва папрацаваць над законамі, якія будуць датычыцца дзейнасці палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў. Не выключана, што трэба прыняць закон аб грамадзянскай супольнасці, каб удакладніць усе ключавыя элементы новай палітычнай сістэмы».*

## Зямное і нябеснае

# ПАДАРУНАК БОГУ І ХРАМУ

Карэспандэнт «Звязды» паспрабавала разабрацца, хто і з якой мэтай робіць падарункі царкве



Айцец Сергій дэманструе падарунак Руслана Аляхно.

**Апошняя навіна на гэту тэму, якую агучылі, напэўна, усе інфармацыйныя каналы, — падарунак беларускага спевака Руслана Аляхно бабруйскаму кафедральнаму сабору ў гонар Свяціцеля Мікалая Цудатворца. Спявак ахвяраваў напрастольнае Евангелле XVIII стагоддзя. З гэтай гісторыі, дарэчы, мы і пачалі размову з настаяцелем храма айцом Сергіем, прэс-сакратаром Бабруйскай епархіі.**

СТАР. 5

## Падрабязнасці

# ЯКАСЦЬ АДУКАЦЫІ, ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ...

## ...якія яшчэ пытанні абмяркоўвалі ў другой палове вучэбнага года?

**«Чарговы вучэбны год перайшоў свой пікавы рубеж. Якім будзе вынік засваення сістэматызаваных ведаў, уменняў і навыкаў, інтэлектуальнага, маральнага і фізічнага выхавання, пакажуць летняя сесія і выпускныя экзамены. Найлепшым стане фарміраванне ў нашых выхаванцаў устаноўкі «Хачу ўмець і хачу падзяліцца тым, што ўмею», а не «Хачу мець», што характэрна для сучасных рэаіснасці», — падкрэсліў у выступленні на выніковай калегіі свайго ведамства міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ.**

СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

# «Вытрымаем! На злосць ворагам»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Па яго словах, калі нашы краіны сарыентуюцца, праз паўгода — да канца года людзі забудуцца, што здарылася з пункту гледжання эканомікі. «І не трэба казаць: «перажывём — не перажывём санкцыі...». Слухайце, мы іх перажывалі колькі заўгодна. Нам трэба адбудаваць нашу эканоміку, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — ***Абыдземся без іх. У нас усё ёсць для таго, каб нармальна жыць і працаваць***».

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў расійскаму калегу: «Слухайце, вы заўсёды дапамагалі сваім саюзнікам. Казахам дапамаглі. Ды ўсім. Рынак вы некаторым адкрылі. Не буду іх называць, яны пакрыўдзяцца. Ну, дык нам трэба неяк сабрацца ў АДКБ, нам трэба ў ЕАЭС сабрацца, згуртавацца разам, бо ўсе казалі аб тым, што нам трэба разам быць. Ну, дык давайце збяромся. І, паверце, яшчэ дадаўшы гэтыя рынкі, мы праз месяц забудзем, што ў нас ёсць санкцыі. Таму АДКБ і ЕАЭС, вось я ўношу прапанову (думаю, Вы мяне падтрымаеце), — ***нам трэба сабрацца ў Маскве, сесці за стол перагавораў і дамовіцца: мы вам гэта прадаём, вы нам — гэта. І выбудоўваем нашу агульную эканамічную палітыку***», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Уладзімір Пуцін на сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам заявіў, што праінфармуе свайго беларускага калегу аб сітуацыі на ўкраінскім напрамку, і перш за ўсё аб тым, як ідуць цяпер перагаворы, якія праводзяцца практычна на штодзённай аснове. «Там ёсць пэўныя пазітыўныя зрухі», — сказаў ён.

Прэзідэнт Беларусі расказаў на сустрэчы ў Крамлі пра нападзенне на войскі Беларусі і Расіі, якое рыхтавалася яшчэ да пачатку ваенных падзей Узброенымі Сіламі Украіны. «Яны пачалі. А я вам зараз пакажу, адкуль на Беларусь рыхтаваўся напад. І калі б за шэсць гадзін да аперацыі не быў нанесены прэвентыўны ўдар па пазіцыях (чатыры пазіцыі, я зараз пакажу — карту прывёз), яны б атакавалі нашы войскі — Беларусі і Расіі, якія былі на вучэннях, — перадае словы Прэзідэнта Беларусі яго прэс-служба. — Таму ***не мы развязалі гэту вайну. У нас сумленне чыстае. Добра, што пачалі. Біялагічная зброя, самыя вялікія электрастанцыі атамныя...***».

Прэзідэнт паведаміў, што да Чарнобыльскай станцыі беларусы амаль сілай падвялі электрычнасць, як ён і паабяцаў.

«Таму ***людзі паціху пачынаюць разумець, што ёсць што і за кім стаіць гэтая праўда***. Не зрабілі б гэта за суткі да таго, паверце, праз некалькі дзён мы б выпілі ўсю гэтую чашу з вялізнымі стратамі. Яшчэ раз кажу: яны не толькі па Данбасе рыхтаваліся нанесці ўдар. Яны выбудавалі пазіцыі для нанясення па Беларусі ўдару», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Таму не трэба апраўдвацца ні перад кім. Я бачу, як нашы, вашы некаторыя паводзяць сябе: ці бачыце, не тое зрабілі. Яны б выпілі гэтую чашу больш, чым у сярэдзіне мінулага стагоддзя, калі гэтыя фашысты на нас рухаліся», — сказаў беларускі Прэзідэнт.

Ён нагадаў пра замежных наёмнікаў, якія ідуць уздоўж границы Беларусі да Чарнобыльскай станцыі. «Тры моманты: яны хочуць перарэзаць шляхі руху расійскіх войскаў — у спіну ўдарыць, як я казаў; другое — яны хочуць ударыць па пазіцыях тых войскаў, якія ў нас засталіся з беларуска-расійскіх вучэнняў, і яны не страчваюць надзею нас уцягнуць у гэтую бойню непасрэдна, каб мы агалілі заходні ўчастак», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

«Не такія яны простыя. І што яны хочуць у Чарнобылі зрабіць, нам яшчэ давядзецца з вамі разгадаць», — дадаў беларускі Прэзідэнт.

Пасля перагаворы лідараў яшчэ доўгі час працягнуліся за зачыненымі дзвярыма.

## Сітуацыя

# На Гомельшчыне ўсё арганізавана для прыёму і размяшчэння грамадзян Украіны

**У Гомельскай вобласці ўсё арганізавана для прыёму і размяшчэння грамадзян, якія прыбываюць з Украіны. Акцэнт на гэтым зрабіў сёння старшыня аблвыканкама Іван КРУПКО, наведваючы пункт спрошчанага пропуску «Паддабранка», перадае карэспандэнт БелТА.**

«Сітуацыя такая, што трэба дапамагаць. З нашага боку ўсё арганізавана. На бліжэйшы час зарэзервавана (месцаў. — **Заўв. БелТА**) да адной тысячы чалавек для знаходжання», — сказаў губернатар. Размова ідзе аб санаторным і гасцінічным фондах.

Іван Крупко адзначыў, што, акрамя прыстанішча, неабходных умоў для пражывання, арганізуюць і трохразовае харчаванне. Ён звярнуў увагу, што неабыякавыя людзі, прадпрыемствы дапамагаюць маючым патрэбу, пералічваючы сродкі праз Чырвоны Крыж.

«Усё, што можам, робім сумленна», — дадаў губернатар.

Начальнік аддзялення пагранічнага кантролю «Цяруха» Васіль Удодаў расказаў, што з 27 лютага праз пункт спрошчанага пропуску «Паддабранка» ў двух напрамках прайшлі амаль 600 чалавек, пры гэтым некаторыя з іх за гэты час зрабілі некалькі рэйсаў туды-назад.

У асноўным праз пункт накіроўваюцца людзі з Беларусі да сваякоў, якія жывуць у найбліжэйшых украінскіх пагранічных пунктах, — з прадуктамі харчавання, прадметамі першай неабходнасці. Ёсць і выпадкі, калі границу перасякаюць для часовага знаходжання ў Беларусі, напрыклад у сваякоў, удакладніў Васіль Удодаў.

Таксама звяртаюцца ў пункт пропуску па кансультатыўную дапамогу — з пытаннямі аб парадку рэгістрацыі на тэрыторыі Беларусі, нюансамі перасячэння границы і г. д.



Фота БелТА.

**Іван КРУПКО падчас сустрэчы з бежанцамі.**

## Інфармацыйная бяспека

# РЭЖЫМ ЦІШЫНІ СУПРАЦЬ ФЭЙКАЎ

**На нарадзе ў адміністрацыі Савецкага раёна горада Гомеля і сустрэчы з педагагічным калектывам у абласным інстытуце развіцця адукацыі намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар ЛУЦКІ адзначыў, што зараз трэба адбіваць агрэсіўныя нападкі ў інфармацыйнай вайне.**



Важныя непасрэдныя стасункі з людзьмі, падчас якіх неабходна выразна данесць дзяржаўную пазіцыю.

— Цяпер трэба супрацьстаяць фэйкаваму бруду, — адзначыў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, — які льецца на Беларусь звонку. У адказ на фэйкі з украінскага боку, розныя небыліцы, што запоўнілі інтэрнэт, у тым ліку і пра тое, што нашы дзеці будуць браць удзел у расійскай ваеннай аперацыі, я б хацеў сказаць, што гэта абсалютна не так. Важна даваць адэкватныя адказы на гэтыя выпады адразу тут і цяпер. Бо наша заўтра залежыць толькі ад кожнага з нас.

Ігар Луцкі акцэнтаваў, што цяпер становішча вакол Беларусі патрабуе асаблівай увагі да паўднёвых рэгіёнаў.

У сустрэчы ўзяў удзел **старшыня праўлення таварыства «Веды» Вадзім ГІГІН**. Ён адзначыў, што сустрэчы з людзьмі ў калектывах — гэта патрэба саміх людзей:

— Сёння мы бачым вялікую колькасць фэйкаў у інтэрнэце. Людзям цяжка разабрацца, дзе праўда, дзе хлусня. Жывыя чалавечыя стасункі дазваляюць настроіць унутраны камертон, які дае чалавеку магчымасць арыентавацца ў складанай, вельмі супярэчлівай інфармацыйнай прасторы.

Вадзім Гігін падкрэсліў, што падчас сустрэч людзі выказваюць трывогу, занепакоенасць, якая справакавана ў тым ліку непраўдзівай інфармацыяй пра спецыяльную ваенную аперацыю ва Украіне.

— Людзей хвалюе, што насамрэч адбываецца ў суседняй краіне, як будзе развівацца сітуацыя. Мяне радуе, што ў нас сфарміравалася здаровае грамадства. Ёсць заклапочанасць, ёсць хваляванне, але ж гэта ёсць па ўсім свеце.

Мы, беларусы, навучыліся разбірацца, не паддавацца на правакацыі. Людзі ўжо бачаць, калі ідзе лжывая інфармацыя. Усё робіцца дзеля таго, каб уцягнуць Беларусь у супрацьстаянне, каб узарваць сітуацыю знутры, ускладніць пазіцыю нашага саюзніка Расійскай Федэрацыі. Але нашы людзі на гэта не ідуць, і я пераканаыны, што мы захаваем мір і стабільнасць у нашай краіне.

Вадзім Гігін падзяліўся рэцэптам інфармацыйнай гігіены. Ён параіў займацца сваімі любімымі паўсядзённымі справамі і прытрымлівацца рэжыму інфармацыйнай цішыні, а таксама абавязкова пераправяраць любую інфармацыю з некалькіх крыніц.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Сусветная эканоміка ўваходзіць у фазу стагфляцыі

Сусветная эканоміка ўваходзіць у фазу дэпрэсіі пры адначасовым рэзкім росце цэн. Пра гэта заявіў галоўны эканаміст паўднёваафрыканскага інвестыцыйнага банка RMB Эцьен ле Ру, паведаміла ТАСС. Эцьен ле Ру адзначыў, што цяперашнія ўзрушэнні ў сусветнай эканоміцы, якія выкліканы хуткім ростам цэн на энергарэсурсы і ажыўленнем інфляцыі, падрываюць у краінах Афрыкі хуткі аднаўленчы рост пасля буйных страт, якія іх эканоміі панеслі з-за пандэміі каранавіруса ў апошнія два гады. «Гэта вельмі сумна, таму што ў многіх афрыканскіх краінах пачалося эканамічнае ажыўленне, — падкрэсліў банкір. — Цяпер яно пастаўлена пад пытанне». На думку вядучых паўднёваафрыканскіх эканамістаў, сусветнай эканоміцы разам з высокімі цэнамі на энерганосьбіты (у першую чаргу на нафту) трэба рыхтавацца да далейшага росту цэн на прадукты харчавання, абясцэньвання грошай і істотнага павелічэння банкаўскіх уліковых ставак.

## Прэзідэнтам Венгрыі ўпершыню абрана жанчына



Новым прэзідэнтам Венгрыі стане Каталін Новак. За яе кандыдатуру прагаласавалі дзве трэці дэпутатаў Дзяржаўнага сходу (аднапалатнага парламента) краіны, паведаміў партал навінаў Index. Новак стане першай жанчынай у гісторыі, якая зойме пасаду прэзідэнта Венгрыі. Яна зменіць Янаша Адэра, які знаходзіцца на пасадзе прэзідэнта з 2012 года, яго тэрмін паўнамоцтваў завяршаецца 10 мая. Да нядаўняга часу Новак з'яўлялася міністрам па справах сям'і, яе кандыдатура была вылучана кіруючай партыяй «ФІДЭС — Венгерскі грамадзянскі саюз», якую ўзначальвае прэм'ер-міністр Віктар Орбан.

## Глабальная пандэмія каранавіруса далёкая ад завяршэння

Пра гэта заявіў генеральны дырэктар Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) Тэдрас Аданам Гебрэесус. Ён падкрэсліў, што вірус працягвае эвалюцыянаваць. Кіраўнік СААЗ нагадаў, што з пачатку пандэміі з-за каранавіруса памерла ўжо больш 6 мільёнаў чалавек. Усяго ў свеце ўжо выявілі больш за 450 млн выпадкаў заражэння COVID-19. Адзнака ў 400 млн была пройдзена 10 лютага, 350 млн — 25 студзеня, 300 млн — 8 студзеня, 250 млн — 9 лістапада мінулага года, 200 млн — 5 жніўня. Больш за ўсё пацверджаных выпадкаў заражэння, даныя аб якіх паступілі ў СААЗ, зарэгістравана ў ЗША — 78,6 мільёна. Далей ідуць Індыя (каля 43 млн), Бразілія (29,1 млн), Францыя (22,5 млн). Пра першую смерць стала вядома 11 студзеня 2020 года. Мільён смяротных зыходаў быў зарэгістраваны 28 верасня. Адзнака 5 млн смерцяў была пераадолена 28 кастрычніка 2021-га. Паводле апошняй інфармацыі, смяротных зыходаў больш за ўсё таксама ў ЗША — каля 955 тысяч, другі радок займае Бразілія (652,8 тысячы), трэці — Індыя (515,4 тысячы).

Парламенцкі дзённік

# ПРАЦАВАЦЬ ПА-НОВАМУ

## Восьмая сесія Палаты прадстаўнікоў адкрыецца 15 сакавіка

**Пра гэта паведаміў старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Валянцін СЕМЯНЯКА на пасяджэнні Савета Палаты прадстаўнікоў.**

Падчас новай сесіі будзе разгледжана 13 праектаў законаў. У першым чытанні абмяркуюць шэраг законапраектаў па крымінальнай адказнасці, донарстве крыві, магістральным транспарце, абыходжанні з адходамі. Некалькі законапраектаў будзе разгледжана ў другім чытанні.

«У той жа час у пастаянных камісіях знаходзіцца каля 30 законапраектаў, якія па меры заканчэння работы над імі будуць уключацца ў парадак дня. Цэлы шэраг законапраектаў будуць уносіць міністэрствы і ведамствы ў рабочым парадку згодна з планам заканадаўчай дзейнасці на 2022 год», — сказаў парламентарый.

Завяршыцца сесія 30 чэрвеня, а дзявятая пачнецца ўжо ў верасні і працягнецца па апошні працоўны дзень чэрвеня 2023 года.

«Такі рэжым работы прапанавалі самі дэпутаты. Мінулы рэжым з дзвюма сесіямі ў год (восеньскай і вясенняй) быў не зусім зручны. Міжсесійны перыяд выпадаў з заканатворчай дзейнасці. Мы выйшлі з ініцыятывай да Канстытуцыйнай камісіі, і яна яе падтрымала. Сёння мы ўжо пачынаем працаваць па-новаму», — тлумачыў змены Валянцін Семяняка.

Ён адзначыў, што дэпутатам неабходна разгледзець карэкціроўку каля 100 законаў і кодэксаў у сувязі з абнаўленнем Канстытуцыі. Асаблівая ўвага тут будзе ўдзелена рэзанансным дакументам, такім як Закон аб Усебеларускім народным сходзе, Закон аб Нацыянальным сходзе, Выбарчы кодэкс, Закон аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў і члена Савета Рэспублікі.

«Гэта дастаткова вялікая работа, якую неабходна завяршыць да сакавіка 2024 года. У той жа час дэпутацкі корпус разумее алгарытм гэтай дзейнасці. Мы да яе падыходзім падрыхтавана, згодна з профілем кожнай камісіі. Я думаю, што гэтыя лёсавызначальныя рашэнні будуць прыняты ў тэрмін, якасна і адказна», — дадаў спікер.

Так, па яго словах, Закон аб УНС разглядзець плануюць ужо ў другой палове бягучага года. «Я бачу так, што ў першым чытанні ў другой палове года праект можа быць разгледжаны, а да канца года можа быць разгледжаны і ў другім чытанні. Падрыхтоўкай гэтага законапраекта будзе займацца Пастаянная камісія па заканадаўстве», — выказаў свае думкі дэпутат.

Выступаючы перад калегамі на пасяджэнні Савета, **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** сказаў, што заканадаўчая дзейнасць павінна выходзіць на прынцыпова новы ўзровень.

«У развіццё новай Канстытуцыі намі будзе прыняты вялікі масіў законапраектаў. Гэта каля 100 кодэксаў і законаў, у тым ліку перавесці актуальныя нормы дэкрэтаў і ўказаў Прэзідэнта ў дзеючыя законы. Пры гэтым павінна быць захавана патрабаванне кіраўніка дзяржавы па забеспячэнні сістэмных падыходаў да заканадаўчага рэгулявання, высокай якасці законаў, іх простасці і зразумеласці для людзей», — заявіў старшыя ніжняй палаты парламента. Ён заклікаў дэпутатаў быць больш актыўнымі і ініцыятыўнымі пры самастойнай распрацоўцы законаў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### ❍ Анонс

### СЕНАТАРЫ АДКРЫЮЦЬ СЕСІЮ

У аўторак, 15 сакавіка, адбудзецца адкрыццё восьмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента. Пачатак пасяджэння — у 12.00.

### ❍ У тэму

**Андрэй САВІНЫХ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах**, пракаментаваў журналістам падзеі, што складваюцца ў свеце: «Міжнародная сітуацыя мае вельмі негатыўныя тэндэнцыі. Усе працэсы паскараюцца, і, на жаль, напружанне ўзрастае. Мы бачым шмат фактараў, што могуць аказаць негатыўны ўплыў на Рэспубліку Беларусь. У гэтых умовах мяняецца і сам характар знешнепалітычных намаганняў і знешняй палітыкі. Ад пошуку новых кантактаў беларуская дыпламатыя пераходзіць да абароны нацыянальных інтарэсаў, суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Мы павінны сёння мысліць у катэгорыях пагроз, што ўзнікаюць, і ў фармаце іх прадухілення. Гэта стане актуальным на сярэднетэрміновую перспектыву. Захаваць свой суверэнітэт, сваю палітычную будучыню магчыма толькі ў саюзах — ваенных, палітычных, эканамічных. Мяркую, што Саюзная дзяржава ў поўнай меры адпавядае гэтым крытэрыям і становіцца гарантам захавання перспектыў на будучыню і для Рэспублікі Беларусь, і для Расійскай Федэрацыі».

Кантэкст

# СЫВАРАТКА ПРАЎДЫ



**Расія запытала пасяджэнне Савета Бяспекі ААН па ваенна-біялагічных праграмах ЗША ва Украіне. Аб гэтым паведаміў першы намеснік пастаяннага прадстаўніка РФ пры сусветнай арганізацыі Дзмітрый Палянскі, паведаміла ТАСС. Кітай таксама заклікаў Вашынгтон растлумачыць сітуацыю вакол дзейнасці размешчаных на тэрыторыі Украіны лабараторый. З адпаведнай заявай выступіў афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР Чжаа Ліцзянь. Пытанне набыло сусветны кантэкст.**

### ФЭЙК, ЯКІ ЛОПНУЎ

Шматлікія «праверкі фактаў» расійскіх заяў аб наяўнасці ва Украіне сакрэтных амерыканскіх біялабараторый абвяшчалі, што ўсё гэта толькі «дэзынфармацыя» Масквы. Аднак намесніца дзяржсакратара ЗША Вікторыя Нуланд фактычна пацвердзіла, што яны там ёсць, паведаміў у сваім сюжэце вядучы Fox News Такер Карлсан. Больш за тое, шмат што паказвае на тое, што дзейнасць гэтых лабараторый вельмі небяспечная, бо сама Вікторыя Нуланд сур'ёзна непакоіцца, што «даследчыя матэрыялы» з гэтых лабараторый трапяць у рукі расійскага боку, заўважыла RT.

Далей ён згадаў цікавыя факты. У першыя ж гадзіны пасля ўводу расійскіх войскаў амерыканская газета USA Today апублікавала артыкул пад загалоўкам «Праверка фактаў: ілжывыя заявы аб біялабараторыях ЗША ва Украіне звязаныя з расійскай кампаніяй па дэзынфармацыі». Хлуснёй і прапагандай назвалі сцвярджэнні аб амерыканскіх лабараторыях на Украіне Foreign Policy. Затым выказаўся і Еўрапейскі саюз, таксама заявіўшы, што «гэта тэорыі змовы» і «хлусня, якая распаўсюджваецца Пуціным».

Аднак усё змянілася пасля таго, як журналісты Fox News натрапілі на матэрыялы слуханняў сенацкага камітэта па міжнародных адносінах. На пытанні там адказвала Вікторыя Нуланд, якая займае пасаду намесніка дзяржсакратара ЗША па Украіне ў адміністрацыі Байдэна. «У 2014 годзе Вікторыя Нуланд зрэжысіравала дзяржаўны пераварот на Украіне — у імя дэмакратыі, вядома. Іншымі словамі, яна вельмі інфармаваная крыніца, датычная ўсяго таго, што адбываецца ў гэтай краіне», — адзначыў журналіст Fox News.

Вікторыя Нуланд гутарыла з сенатарам ад Фларыды Марка Рубіа і на пытанне аб наяўнасці ва Украіне біялагічнай зброі адказала літаральна наступнае: «Ва Украіне ёсць... аб'екты, дзе праводзяцца біялагічныя даследаванні. Мы скарэ рагаемся, што іх могуць паспрабаваць узяць пад свой кантроль расійскія войскі. Так што мы разам з украінцамі спрабуем зрабіць так, каб гэтыя даследчыя матэрыялы не трапілі ў рукі расійскім сілам, калі яны падыдуць бліжэй».

«Каб не мацюкацца ў эфіры, проста скажу, што ў нас адпалі сківіцы. На адкрытым слуханні ў камітэце Вікторыя Нуланд пад прысягай толькі што пацвердзіла, што расійская дэзынфармацыя — якая, казалі нам на працягу некалькіх дзён, гэта амаральная хлусня, тэорыя змовы і трызненне, насамрэч — абсалютная праўда. Нічога сабе. Такое ў Вашынгтоне не кожны дзень пачуеш. Сенсацыя, можна сказаць», — заключыў вядучы Fox News Такер Карлсан.

### БІЯАГЕНТЫ ДЛЯ СЛАВЯН

Адзін з атрыманых Узброенымі Сіламі Расіі дакументаў пацвярджае, што ўсе даследаванні падвышанай небяспекі ва ўкраінскіх біялабараторыях праводзіліся пад кіраўніцтвам спецыялістаў з ЗША, паведаміла ТАСС са спасылкай на начальніка войскаў радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны УС РФ Ігара Кірылава. Паводле яго слоў, разліковая ведамасць налічэння заработнай платы пацвярджае факт выплат упраўленнем Міністэрства абароны ЗША грашовых сродкаў за ўдзел у даследаваннях напрамку, без прыцягнення пасрэднікаў.

Адной з задач ЗША і іх саюзнікаў з'яўляецца стварэнне біяагентаў, здольных выбарча паражаць розныя этнічныя групы, у прыватнасці славян, заявіў начальнік войскаў радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны. Ён адзначыў, што прадстаўнікі заходніх дзяржаў вельмі асцярожна ставяцца да перадачы сваіх біяматэрыялаў, пры гэтым па мяжу была перададзена вялікая колькасць сывараткі крыві жыхароў розных абласцей Украіны, якія адносяцца выключна да славянскага этнасу. «З высокай доляй верагоднасці можна гаварыць аб тым, што адной з задач ЗША і іх саюзнікаў з'яўляецца стварэнне біяагентаў, здольных выбарчна паражаць розныя этнічныя групы насельніцтва», — сказаў Ігар Кірылаў.

### ПТУШКІ ДАСТАЎЛЯЮЦЬ ВІРУСЫ

У лабараторыях ЗША ва Украіне праводзіліся эксперыменты з узорамі каранавіруса лятучых мышэй. Пра гэта заявілі ў Міністэрстве абароны Расіі. «Асаблівую цікавасць выклікала дэталёвая інфармацыя аб рэалізацыі ЗША на тэрыторыі Украіны праекта па вывучэнні пераносу патагенаў, якія мігрыруюць паміж Украінай і Расіяй, іншымі суседнімі краінамі дзікімі птушкамі», — адзначыў афіцыйны прадстаўнік Мінабароны Расіі Ігар Канашэнкаў. Ён удакладніў, што, згодна з дакументамі, амерыканскі бок планаваў весці ва Украіне сёлета работы па патагенах птушак, лятучых мышэй і рэптылій з далейшым пераходам да вывучэння магчымасці пераносу імі афрыканскай чумы свіней і сібірскай язвы. «Мэтай гэтых і іншых фінансуемых Пентагонам біялагічных даследаванняў ва Украіне з'яўлялася стварэнне механізму схаванага распаўсюджвання смяротных патагенаў», — заявіў Ігар Канашэнкаў.

Іншымі словамі, усё гэта вельмі падобна на тое, што Пентагон планаваў стварыць з птушак і жывёл не што іншае, як сродкі дастаўкі біялагічнай зброі, вельмі дакладнай, выбарчай, але пры гэтым даказаць сам факт ужывання зброі практычна немагчыма, адзначыў 1tv.ru. Адзін з атрыманых расійскімі вайскоўцамі дакументаў якраз сведчыць аб тым, што акальцаваных птушак з харкаўскай лабараторыі адлоўлівалі ў Варонежскай і Іванаўскай абласцях. «Сталі вядомыя падрабязнасці праекту UP-4, які рэалізоўваўся з удзелам лабараторый Кіева, Харкава і Адэсы і быў разлічаны на перыяд да 2020 года. Яго мэтай з'яўлялася вывучэнне магчымасці распаўсюджвання асабліва небяспечных інфекцый праз мігрыруючых птушак, у тым ліку высокапатагеннага грыпу H5N1, лятальнасць якога для людзей дасягае 50 працэнтаў, а таксама хваробы Ньюкасла.

У сувязі з тым, што Украіна мае ўнікальнае геаграфічнае становішча, дзе перасякаюцца транскантынентальныя шляхі міграцыі, у рамках гэтага праекта было вывучана 145 біялагічных відаў. Пры гэтым былі выяўлены як мінімум два віды пералётных птушак, маршруты якіх праходзяць пераважна праз тэрыторыю Расіі», — паведаміў начальнік войскаў радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны.

### НЕБЯСПЕЧНЫЯ ПАТАГЕНЫ

Нервозныя выказванні амерыканскіх улад сведчаць аб сур'ёзнай занепакоенасці Белага дома раскрыццём ісціны аб работах па ваенна-біялагічнай праграме каля граніц Расіі пры фінансаванні ЗША, лічыць пасол РФ у ЗША Анатоль Антонаў. Ён таксама заклікаў амерыканскія ўлады неадкладна згарнуць усе работы па ваенна-біялагічнай праграме, у тым ліку на тэрыторыі постсавецкай прасторы. «ЗША па-ранейшаму застаюцца адзінай краінай — удзельніцай Канвенцыі аб забароне хімзброі, якая дагэтуль не выканала свае міжнародныя абавязацельствы», — заўважыў Анатоль Антонаў.

Гарачую тэму актыўна абмяркоўваюць у Штатах. «Мяне гэта моцна непакоіць, як і кожнага амерыканца, ды і любога чалавека ў свеце. Сур'ёзнасць гэтай сітуацыі нельга недаацэньваць, — заўважыў член Палаты прадстаўнікоў ЗША ў 2013—2021 гадах. Тулсі Габбард. — Па-першае, сама Нуланд не стала адмаўляць наяўнасць біялагічнай ці хімічнай зброі ва Украіне. Мы сутыкнуліся з высокай верагоднасцю таго, што ў выніку разбурэння адной ці некалькіх лабараторый пад ударам апынуцца не толькі жыхары Украіны. Калі на волю вырвуцца патагены па тыпе таго ж COVID-19, з якім мы змагаемся зараз, нам усім пагражае новы глабальны крызіс».

Тым часам Сусветная арганізацыя аховы здароўя рэкамендавала Украіне знішчыць асабліва небяспечныя патагены, якія захоўваюцца ў лабараторыях краіны, каб прадухіліць магчымыя ўцечкі. Пра гэта гаворыцца ў электронным лісце СААЗ агенцтву Reuters, паведамляе РІА «Навіны». Арганізацыя не паведаміла, калі была зроблена рэкамендацыя, а таксама не прадставіла канкрэтнай інфармацыі аб відах патагенаў або таксінаў, якія захоўваюцца ў лабараторыях Украіны. Ці былі выкананы рэкамендацыі СААЗ, таксама невядома.

**Пётр ДУНЬКО.**

Кампетэнтна

# Неабходнасці прыёму прэпаратаў ёду няма!

## Медыкі папярэджваюць аб іх небяспецы

**З'яўленне ў інтэрнэце лжывай інфармацыі аб павышэнні ўзроўню радыяцыі на тэрыторыі Беларусі пацягнула за сабой вялізную колькасць рэкамендацый наконт прыёму прэпаратаў ёду. Беларуская медыцынская супольнасць звяртае ўвагу на тое, што многія з гэтых рэкамендацый могуць быць вельмі небяспечныя. У цяперашні час адсутнічае радыяцыйная небяспека для насельніцтва Беларусі, адпаведна няма неабходнасці прыёму прэпаратаў ёду, паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя.**

Асабліва небяспечна рэкамендаванае ў шэрагу інтэрнэт-чатаў нанясенне раствору ёду вонкава ў выглядзе ёднай сеткі на скуры для будучых матуль. Пры працяглым ужыванні без рэкамендацый урача раствору ёду спіртавога 5 % магчыма з'яўленне насмарку, крапіўніцы, слінааддзялення, слёзацёку, высыпанняў на скуры, фарміраванне таксічнай адэномы, аўтаімунных захворванняў шчытападобнай залозы (аўтаімунны тырэаідыт). Пры передазаванні магчымыя запаленне слізістых абалонак у месцах вылучэння ёду, раздражненне, апёкі.

**Даведка:** *Запарожская АЭС размешчана на вялікай адлегласці ад межаў Беларусі, і нават у выпадку ядзернай аварыі на гэтай станцыі пагроза здароўю і жыццю для насельніцтва нашай краіны адсутнічае.*

*На Чарнобыльскай АЭС цяпер няма дзейных атамных рэактараў — усе яны выведзены з эксплуатацыі. На пляцоўцы размешчаны сховішчы радыеактыўных адходаў і адпрацаванага ядзернага паліва, аварыйны чацвёрты блок закрыты спецыяльным ахоўным збудаваннем (канфайнмент). У выніку абястучвання пляцоўкі Чарнобыльскай АЭС ядзерны выбух адбыцца не зможа.*

У Беларусі працуе аўтаматычная сістэма кантролю радыяцыйнай абстаноўкі. З радыяцыйным становішчам можна азнаёміцца самастойна, анлайн-карты ёсць у свабодным доступе, інфармацыя падаецца ў аўтаматычным рэжыме з усіх датчыкаў у Беларусі, краінах Еўрапейскага саюза і за яго межамі. Цяпер радыяцыйнае становішча на тэрыторыі Беларусі ў норме і не перавышае фонавыя значэнні (0,1-0,2 мкЗв/ч).

— Міністэрства аховы здароўя перакanaўча просіць грамадзян захоўваць спакой, не панікаваць і не прымаць прэпараты ёду самастойна, — падкрэслілі ў прэс-службе ведамства.

### Навошта і калі прымаюць прэпараты ёду?

Блакіраванне шчытападобнай залозы (прыём прэпаратаў ёду ў вялікай дазіроўцы) з'яўляецца небяспечнай мерай. Прэпараты ёду неабходна ўжываць абгрунтавана — у выпадку ядзернай аварыі. Паўторны прыём прэпаратаў павінен праводзіцца толькі ў крайніх выпадках. Для абароны шчытападобнай залозы ў выпадку радыяцыйнай аварыі прызначаюцца дастаткова вялікія дозы калію ёдыду. Аднак для прызначэння ёсць супрацьпаказанні. Асабліва проціпаказана самастойна прымаць дадзены прэпарат дзецям, цяжарным жанчынам і асобам, якія маюць захворванні шчытападобнай залозы. Прэпарат павінен прымацца не раней, чым за 24 гадзіны да праходжання воблака або апраменьвання і не пазней за 8 гадзін пасля гэтага.

Блакіраванне шчытападобнай залозы без астатніх ахоўных мер не абароніць ад іншых шляхоў апрамянення і праводзіцца толькі пры радыяцыйнай аварыі на дзеючых і эксплуатуемых ядзерных аб'ектах (атамныя станцыі, даследчыя рэактары).

У выпадку пагрозы для здароўя Міністэрства аховы здароўя і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях праінфармуюць насельніцтва аб пачатку правядзення блакіравання шчытападобнай залозы і неабходнасці прыёму прэпаратаў ёду праз усе магчымыя каналы сувязі: смс на тэлефон, афіцыйныя рэсурсы — сайт, тэлеграм, сацыяльныя сеткі, з дапамогай радыё, тэлебачання і іншых сродкаў масавай інфармацыі.

Беларускія эксперты распрацавалі афіцыйныя рэкамендацыі па прыёме прэпаратаў ёду.

### Як працуе ёдыд калію (ЁК)?

Шчытападобная жалеза не здольная адрозніваць стабільны ёд ад радыеактыўнага (нестабільнага). Яна абсарбіруе абодва яго віды. ЁК прадухіляе трапленне радыеактыўнага ёду ў шчытападобную залозу: пры прыёме вялікіх доз ЁК стабільны ёд у прэпараце паглынаецца шчытападобнай залозай, яна «насычаецца» і не можа найбліжэйшыя 24 гадзіны больш абсарбіраваць ёд — ні стабільны, ні радыеактыўны.

### Як часта яго трэба прымаць?

Разавая доза ЁК абараняе шчытападобную залозу на працягу 24 гадзін. Пры ўздзеянні радыеактыўнага ёду больш за суткі рэкамендаваны прыём разавай (сутачнай) дозы ЁК на працягу некалькіх дзён.

### Якія пабочныя эфекты?

Пабочныя эфекты могуць уключаць расстройства страўнікава-кішачнага тракту, алергічныя рэакцыі, скурны сып і запаленне слінных залоз, фарміраванне таксічнай адэномы, аўтаімунных захворванняў шчытападобнай залозы (аўтаімуннага тырэаідыту, дыфузна-таксічнага валяку).

### Хто можа прымаць ЁК?

Да найбольшай рызыкі паражэння радыеактыўным ёдам схільная шчытападобная жалеза плоду і нованароджанага. Нованароджаныя і дзеці ранняга ўзросту маюць высокую рызыку развіцця раку шчытападобнай залозы пасля ўздзеяння радыеактыўнага ёду. Гэтая група дзяцей павінна атрымаць аднаразовую дозу ЁК (выключэнне — дзеці, якія знаходзяцца на грудным кармленні пры правядзенні ёдавай абароны ў маці). Таксама ЁК рэкамендаваны ўсім дзецям, якія падвергліся забруджванню радыеактыўным ёдам, маладым дарослым (ад 18 да 40 гадоў). Цяжарныя павінны прымаць ёдыд калію абгрунтавана — толькі адну разавую дозу пасля выкіду радыеактыўнага ёду, бо ён пранікае праз плацэнту.

Дарослым, старэйшым за 40 гадоў, не рэкамендаваны прыём ЁК, бо яны маюць найменшую верагоднасць развіцця раку шчытападобнай залозы пасля выкіду радыеактыўнага ёду.

### Як прымяняецца ЁК?

Ён выдаецца ва ўстанове аховы здароўя пасля аварыйнай сітуацыі, звязанай з радыеактыўным ёдам. Цяпер існуюць спецыяльныя формы ёдыду калію (таблеткі і вадкасць), якія можна прымаць унутр.

**Алена КРАВЕЦ.**

---

Арэнда нерухомасці

# КАЛІ ПРАПАНОВА ПЕРАВЫШАЕ ПОПЫТ

## Шмат кватэр сталіцы даволі працяглы час цяпер стаяць пустыя

**Сітуацыю, якая цяпер назіраецца на рынку доўгатэрміновай арэнды, эксперты параўноўваюць з той, што адбывалася ў пачатку 2015 года. Тады курс замежнай валюты за зусім кароткі час вырас практычна ў два разы. Але цяпер сітуацыя ўскладняецца і іншымі фактарамі. Зараз людзі не спяшаюцца ехаць у буйныя гарады на сезонную працу, іх палохае пандэмія ў месцах, дзе шмат людзей, і тое, што заробак на новым месцы можа не пакрыць у поўнай меры выдаткі на арэнду жылля.**

### Не хапае кватарантаў...

Адна з галоўных асаблівасцяў арэнднага жылля, якая назіраецца цяпер на рынку, — рэзкае зніжэнне попыту, лічыць **начальнік аддзела арэнды жылля агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Маргарыта ПАЧЫЦКАЯ.** Так атрымалася, што за апошнія 10 дзён колькасць заявак на арэнду жылля знізілася практычна напалову.

Паводле інфармацыі найбуйнейшых агенцтваў нерухомасці, за апошні тыдзень заявак на арэнду стала на 80 % менш. У самым слабым становішчы знаходзяцца элітны сектар і верхняя планка камфорту — гэта тыя кватэры, якія прапануюцца ў арэнду вышэй за сярэдненрыначны кошт.

### ПАТРАБУЕЦЦА КАРЭКЦІРОЎКА ТАРЫФАЎ

Варта ўлічваць, што кошт арэнды кватэр у нас арыентуецца на доларавыя значэнні, а заробак большасць беларусаў атрымлівае ў беларускіх рублях. У такім выпадку ўзнікае сутыкненне інтарэсаў уладальнікаў кватэр і іх арандатараў, калі пры ваганні абменнага курсу здымаць жыллё становіцца даражэй, — роўна настолькі, наколькі вырас абменны курс.

У выніку набягаюць вельмі вялікія сумы, якія не маюць нічога агульнага з тымі, якія павінны быць цяпер на рынку. Імгненнае павелічэнне даходнасці жылля не павінна адбывацца за кошт празмернага цяжару для кватарантаў. У гэтым выпадку Маргарыта Пачыцкая адзначае, што ўласнікі павінны самастойна прывязваць бягучы кошт арэнды да ранейшага курсу і зафіксаваць на значэнні, напрыклад, 2,6—2,7 рубля за долар.

Калі мы возьмем 250 долараў за акуратную аднапакаёвую кватэру, то, зыходзячы з курсу 2,6, цяпер яна павінна каштаваць 650 беларускіх рублёў (без уліку камунальных плацяжоў — яны аплачваюцца арандатарам асобна), але ніяк не 850 рублёў, як атрымліваецца па новым курсе.

### ЛЕПШ АДРАЗУ ЗНІЗІЦЬ ЦАНУ

Маргарыта Пачыцкая параўнала два варыянты для ўласніка. У першым выпадку ён зніжае цану, у другім — шукае новага арандатара.

Возьмем факт, што ўладальнік здае кватэру за 250 долараў. У сітуацыі, якая склалася, арандатар просіць невялікую зніжку — 30 долараў. Але гаспадар кватэры палічыў, што за 12 месяцаў атрымаў бы тры тысячы долараў, а па зніжанай цане атрымае 2640 «зялёных», значыць, страціць за год 360 долараў. Ён адмаўляецца. Калі кватарант сыходзіць, атрымліваецца два месяцы прастою — гэта ўжо 440 долараў страчанай выгады плюс высокая камуналка (у арэндных кватэрах часцей за ўсё ніхто не прапісаны). Можна дадаць яшчэ 200 рублёў за два месяцы. Усяго 500 долараў страты. І гэта толькі за два месяцы, а ўлічваючы зніжэнне попыту і тое, што арэндадаўца хоча змяніць кошт пакрысе, цалкам магчыма, што і за гэты час ён не знойдзе новых кліентаў па старой цане — і страты будуць яшчэ большыя.

Некаторыя ўласнікі, па назіраннях экспертаў, арыентуюцца на ІТ-сегмент — арандатараў, якія не залежаць ад ваганняў курсу, таму што іх зарплата прывязаная да долара. Асабіста я пяць гадоў здаваў кватэру праграмістам. Дык вось, скажу са свайго досведу: ні адзін арандатар (тым больш айцішнік), разумеючы, што ён можа сэканоміць, не будзе пераплачваць проста так.

### УВЕСНУ КВАТЭР СТАНОВІЦЦА ЦЯПЕР БОЛЬШ

Яшчэ адна з асаблівасцяў рынку — кватэр, якія прапануюць у арэнду, становіцца больш. Справа ў тым, што вясной многія людзі сталага ўзросту з'язджаюць з гарадскіх кватэр на дачы. А каб кватэра не стаяла проста так, здаюць яе ў арэнду. Цяпер тэхналогіі дазваляюць зрабіць гэта і дыстанцыйна. У нас гэта называецца арэндай па даверанасці. І калі раней такой паслугай карысталіся ў асноўным для здачы элітных кватэр і катэджаў, то цяпер сітуацыя змянілася. У лютым—сакавіку з'явіліся прапановы з сегментаў «бюджэт» і «камфорт», якія гатовыя здаваць сваё жыллё дыстанцыйна.

Паводле падлікаў агенцтва, на сёння рынкавы кошт кватэр у бюджэтным сегменце знізіўся прыблізна на 35 %, а ў сегментах «камфорт» і «эліт» — да 50 %. Асаблівa невясёлая сітуацыя назіраецца ў сегменце дарагіх кватэр. Прычына ў тым, што цяпер практычна не засталося плацежаздольнай аўдыторыі для гэтых сегментаў. І здаць кватэру па старых стаўках проста нерэальна, яны нежыццяздольныя.




Кватэры камфортнага і элітнага сегментаў сталі губляць сваю мэтавую аўдыторыю яшчэ ў 2020 годзе, калі закрылі межы з-за каранавіруса. Такое жыллё карысталася папулярнасцю, у прыватнасці, у супрацоўнікаў міжнародных кампаній.

### КВАТАРАНТУ НЕ ВАРТА САРОМЕЦЦА

Акрамя парады аб зніжэнні цэн, эксперт дае яшчэ некалькі рэкамендацый кватарантам і ўладальнікам кватэр. Калі яшчэ ў снежні ўсе раілі гаспадарам прыглядзецца да замежных студэнтаў, якія аддаюць перавагу добрым кватэрам, то цяпер, у іх адсутнасць, раім звярнуць увагу на арандатараў, з якімі раней не збіраліся мець спраў. Дапусцім, сем'і з жывёламі і з дзецьмі.

Зняць кватэру сем'ям з дзецьмі або адзінокаму з жывёламі стала крыху прасцей ужо ў мінулым годзе. Тады ІТ-арандатараў стала не хапаць на ўсе добрыя і якасныя кватэры, і ўласнікі сталі шукаць варыянты. Правільна, цану трэба знізіць і разлічваць не на адзінокага айцішніка, а глядзець у бок сям'і, прапісаўшы рызыкі ў дагаворы. І арандатарам, і арэндадаўцам эксперт раіць падыходзіць да пытання спакойна і абмеркаваць далейшае супрацоўніцтва.

Большасць уласнікаў — цалкам талковыя людзі, ім проста трэба трохі часу, каб прыйсці да рашэння аб зніжэнні цаны. Зараз кватаранты будуць ініцыяваць перамовы аб тым, каб знізіць стаўку. І да гэтага пытання трэба падыходзіць аргументавана: не проста «мы хочам», а сесці і разам палічыць, які быў кошт арэнды ў беларускіх рублях у студзені і прывязацца да вызначанага курсу. У любым выпадку, ініцыятыва павінна зыходзіць ад арандатара.

Ёсць лайфхакі з рынку камерцыйнай нерухомасці, якія Маргарыта Пачыцкая прапануе выкарыстоўваць у сітуацыі арэнды жылля. Як варыянт, можна дамовіцца наступным чынам: для таго каб уліцыць і інтарэсы ўласніка кватэры, пры бягучай фіксацыі курсу на ўзроўні 2,6 рубля, калі курс долара вырастае яшчэ больш чым на 10 %, то з кожнымі 10 % можна падымаць зафіксаваны вамі курс на адну дзясятую. Атрымліваецца так, калі курс вырас на 9 %, пакідаем на ўзроўні 2,6 рубля за долар, а калі на 11 % — павялічваем да 2,7 рубля. Лічбы могуць быць вашымі. Галоўнае — прывесці да аднэй роўніцы, якая задаволіць абодва бакі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ПАДАРУНАК БОГУ І ХРАМУ

## НЕ ДЗЕЛЯ ПІЯРУ

Вялікая кніга ў металічным залацістым акладзе, упрыгожаная чаканкай і паўкаштоўнымі камянямі, — сапраўды вельмі дарагі падарунак. І вельмі сакральны. Гэта ж колькі пакаленняў размаўляла праз яе з Богам. Фаліянт аднаўлены майстрамі Елісавецінскага манастыра, і па яго выглядзе не скажаш, што яму некалькі стагоддзяў. Бацюшка беражліва адкрывае вокладку і дэманструе тытульную старонку, дзе на царкоўна-славянскай мове напісана: «Повелением Благочестивейшей, Самодержавнейшей Великия Государыни нашея императрицы Екатерины Алексеевны Всея Руси; при наследнике ея благоверном Государе Цесаревиче и Великом князе Павле Петровиче и при супруге его Благоверной Государыни Великой княгини Марии Федоровне; при Благоверных государях и великих князьях Александре Павловиче и Константине Павловиче; благословением же Святейшаго Правительствующаго Синода напечатана книга сея Священное Евангелие в царствующем великом граде Москве в лето от сотворения мира 7287, от рождества же по плоти Бога Слова 1779 год, индикта 12, месяца иуниа».

Пярэднюю частку вокладкі ўпрыгожвае чаканка на тэму Сашэсця Хрыста ў пекла.

— Да Уваскрэсення Хрыстова ўсе: і праведнікі ў тым ліку — ішлі ў пекла за першародны грэх Адама і Евы, — тлумачыць айцец Сергій. — Але людзі верылі, што прыйдзе Месія і выратуе іх. Вось якая моцная вера была, самая што ні ёсць сапраўдная! А цяпер выбірай пры жыцці: рай або пекла. І мы гэтага не цэнім.

З другога боку Евангелля таксама сімвалічная выява — раскрыжаванне Хрыста.

— Да Выратавальніка смерць на крыжы была самая ганебная, — каментуе бацюшка. — Але Хрыстос выкупіў нас сваёй крывёю ад граху і Крыж стаў сімвалам жыцця і зброяй супраць сатаны.

Калі Руслан Аляхно падараваў гэта Евангелле сабору, пайшлі размовы, што яно было сямейным. Айцец Сергій адназначна кажа, што не. Гэта Евангелле наогул не для дамашняга чытання, а — напрастольнае. Яго месца заўсёды было ў храмах. А вось што падштурхнула заслужанага артыста зрабіць такі шырокі жэст, можна толькі здагадвацца. Бабруйск — яго малая радзіма, ён ганаровы грамадзянін горада — чаму б не ахвяраваць нешта каштоўнае для землякоў. Да таго ж Руслан — чалавек веруючы.




**Памятная шыльда ў прытворы сабора Свяціцеля Мікалая Цудатворца.**

— Тое, што рабілася гэта не дзеля піяру, магу сказаць з поўнай адказнасцю, — адзначае свяшчэннік. — Руслан сам іпадыяканствуе пры Ялохаўскім саборы ў Маскве — памочнік пры службе архіерэя. У праграме «Прывітанне, Андрэй» з яго удзелам было відэа, дзе ён у стыхары падчас службы чытае Евангелле. Да таго ж у Руслана веруючая хрысціянская сям'я, ён з братам з дзяцінства ўбіраў у сябе праваслаўную культуру. А калі Бог датыкаецца да сэрца чалавека, усё адбываецца само сабой.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Рарытэтнае Евангелле прыхаджане сабора могуць убачыць падчас святочных богаслужэнняў. Яно займае пачэснае месца на прастоле ў цэнтры храма. «Так і ў жыцці павінна быць, — заўважае суразмоўца. — Цэнтр існавання чалавека — гэта Бог, яго Слова. Ёсць нават такое выказванне: у каго Бог на першым месцы, усё астатняе — на сваіх месцах».

## ХРАМ — ТАКСАМА... ПАДАРУНАК

Захаваліся дакументы, што ў XVII стагоддзі на месцы сабора Свяціцеля Мікалая была ўніяцкая мікалаеўская царква.







**Айцец Сергій каля іконы Свяціцеля Спірыдона Трыміфунцкага і тапачка святога, якія таксама падораны храму дабрадзеямі.**

Пасля падзелу Рэчы Паспалітай гэта стаў цалкам праваслаўны храм. У 60-я гады мінулага стагоддзя з яго зрабілі басейн, а вернікам вярнулі толькі ў 2003-м. У прытворы храма вісіць дошка, дзе названы прозвішчы тых, дзякуючы каму ён быў адноўлены.

— Храм шматпакутны, басейн быў нават у алтары, — з горыччу кажа айцец Сергій. — Пакуль ішла яго перадача вернікам, сеансы плавання працягваліся. Бацюшка Аляксандр, які быў на той момант настаяцелем, вёў службы ў «панамарцы», ад басейна яе аддзяляла толькі шторка. За ёй грымела музыка, а асабліва цынічныя аматары плавання дзеля забавы пляскалі яму пад ногі ваду. Гэты свяшчэннік ужо пайшоў з жыцця, але пасля сябе пакінуў добрую памяць. Менавіта дзякуючы яго намаганням і тых спонсараў, якія дапамаглі яму аднавіць гэты храм, сёння тут кожны дзень ідуць службы і ўзносіцца за ўсіх нас малітва перад Богам.

Напэўна, і сам свяціцель Мікалай дапамагае свайму сабору. Аднойчы айцец Сергій так захапіўся ўнутраным уладкаваннем храма, што непрыкметна залез у вялікую даўгавую яму. Пакуль думаў, дзе ўзяць грошы, прыйшла добрая навіна. Казначэй распячатаў скарбонку, што стаіць у пярэдняй частцы храма, а там роўна тая сума, якую трэба было аддаць.

## УМЕННЕ АХВЯРАВАЦЬ — ДАР БОЖЫ

У кабінеце настаяцеля цэлая шафа з патрапанымі кнігамі, пашарпанымі іконамі і крыжамі. Гэта таксама падарункі. Праўда, людзі іх неслі сюды не з думкай падзяліцца самым лепшым, што ў іх ёсць, а — аддаць непатрэбнае. Маўляў, ад бабулі засталося — не выкідаць жа. Непатрэбнымі аказаліся Псалтыр, царкоўна-славянскі слоўнік 1908 года, нават класічная літаратура. Побач з царкоўнымі кнігамі некалькі томікаў Хэмінгуэя, Жуля Верна, Шэкспіра, Андэрсэна.

— На жаль, моладзь цяпер чытаць не жадае, — уздыхае бацюшка. — Не разумеюць маладыя людзі, што без практыкі чытання немагчыма скласці пісьменны сказ у галаве. Навошта, кажуць яны, чытаць, калі ёсць тэлефон. Ён дапаможа і сказ скласці, і коскі расставіць. Але што адбудзецца, калі інтэрнэт адключыцца? Поўная дэбілізацыя грамадства?

Непатрэбных людзям кніг і ікон у кабінеце бацюшкі становіцца ўсё больш. Ён ужо падумвае, што было б нядрэнна зрабіць музей, як у Гомелі пры Мікольскім мужчынскім манастыры. Там захоўваюцца старадаўнія кнігі, іконы, рызы. І людзям больш зручна рабіць такога кшталту падарункі. Усё ж такі тым, што самому патрэбна, цяжэй падзяліцца.

— Я сам над гэтым шмат разважаў, чаму? — разважае свяшчэннік. — Чаму багатыя людзі будуюць для сябе вялікія грувасткія палацы, а зрабіць маленькі храм або бальніцу не могуць. Адзін мудры свяшчэннік аднойчы мне адкрыў вочы. Гэта не яны не могуць, а Бог не прымае ад іх ахвяры, сказаў ён, нават такой думкі ім не дае. Гэта ж табе не індульгенцыя, каб адкупіцца ад грахоў. Гэтую думку яшчэ трэба заслужыць. Атрымаць міласць, каб Бог прыняў ад цябе ахвяру. Ёсць вельмі багатыя людзі ў свеце, але яны пра гэта наогул не думаюць. І Руслану Аляхно думка ахвяраваць прыйшла зверху. Ён не алігарх, проста самадастатковы чалавек, але Гаспадзь паклаў яму на розум такую ідэю. І жонка Юлія яго падтрымала. Веруючыя людзі заўсёды ставяцца адно да аднаго з любоўю. Вельмі складана, калі адзін верыць, а другі не. Кажуць, што ад няверуючай жонкі ратуецца веруючы муж, і наадварот. Але наколькі ж моцным трэба быць, каб усё вытрымаць. Хочацца па стале кулаком, а нельга. Трэба любоў сваю хрысціянскую паказаць.

## ЗА ЎСЁ ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ

Яшчэ ў Старым Запавеце гаворыцца пра ахвяраванні. Памятаеце пра Каіна і Авеля? Каін прынёс у дар Богу плады, якія сабраў, але не вельмі добрыя, а Авель ад свайго статка аддаў самае лепшае ягня. Нядзіўна, што Богу спадабалася чыстая ахвяра Авеля, а вось на дар Каіна ён нават не зірнуў.

— Людзі заўсёды прыносілі ў храм самае лепшае, што ў іх было, — кажа айцец Сергій. — Гэта не тое ж самае, як сёння: прынеслі, асвяцілі і забралі. Сэнс у тым, што ты нешта вырасціў, прынёс у храм і пакінуў. Каб гэтым маглі скарыстацца іншыя, у каго такога няма. Бог даў нам вялікі дар жыцця, свабоду, самога сябе, нарэшце, але мы не ўдзячныя яму за гэта. Калі ёсць магчымасць зрабіць уклад і прынесці дар Богу, Дому Божаму, яе не трэба ўпускаць. Калі ты да яго з адкрытым сэрцам, ён аддзячыць так, што ў цябе будзе ўсё. А не з думкай «дай паспрабую і пагляджу, што будзе». Так ні ў якім разе рабіць нельга. Толькі ад усяго сэрца. І тады ўсё па-іншаму становіцца ў жыцці.

У кожным храме можна ўбачыць падарункі ад шчодрых прыхаджан. Бабруйскі жаночы манастыр Святых Жонак-Міраносіц, які сёння мае вельмі вялікую патрэбу ў шчодрых людзях, бо знаходзіцца на тэрыторыі помніка гісторыі і архітэктуры — Бабруйскай крэпасці і займаецца аднаўленнем яго паўразбураных будынкаў, вельмі ўдзячны за тыя святыні, якія яму ахвяруюць. Ад папячыцеляў богаўгодных устаноў Аляксандра Прэснякова і Васілія Баранчука манастыр атрымаў прывезеныя з Іерусаліма абраз Божай Маці Скорапаслушніцы і ікону з часцінкай каменя ад Гроба Гасподняга, на якім цудоўным чынам адлюстраваўся вобраз Хрыста ў труне. Тут таксама моляцца за бізнесмена Канстанціна, які, нягледзячы на асабістыя праблемы і пакручасты лёс, займаецца добрымі справамі. Ён падараваў манастыру абраз Божай Маці Скорапаслушніцы з Афона. Гэты ж чалавек прывёз з Афона ікону і для Свята-Мікольскага сабора.

**«Гэта не тое ж самае, як сёння: прынеслі, асвяцілі і забралі. Сэнс у тым, што ты нешта вырасціў, прынёс у храм і пакінуў. Каб гэтым маглі скарыстацца іншыя, у каго такога няма».**

У саборы наогул шмат каштоўных святынь. Адзін толькі тапачак Святога Спірыдона, расшыты золатам, чаго варты. Айцец Сергій кажа, што гэта вельмі вялікая і дарагая святыня, бо захоўваецца не ў выглядзе нейкага там кавалачка, а цалкам. Дабрадзей пажадаў застацца невядомым. Маўляў, дабро не трывае мітусні.

Яшчэ адну ікону — бабруйскую Адыгітрыю — падарыў заснавальнік і дырэктар Цэнтра «Покрыва» Андрэй Зубенка.

Беражліва захоўваецца тут падарунак былога Экзарха Усей Беларусі Філарэта — часцінка мошчаў Святога Ваніфація ў спецыяльна зробленым каўчэгу. Гэтаму святому моляцца ад п'янства і наркаманіі. У саборы кожную суботу служыцца яму малебен. Некалькі ікон храму падарыў і епіскап Бабруйскі і Быхаўскі Серафім. Айцец Сергій заўважае, што шмат свяшчэннікаў адкладваюць грошы менавіта для таго, каб нешта купіць для ўпадабанага храма ад сябе асабіста.

— Можна, вядома, гнацца за чымсьці ўсё жыццё і быць бедным, маючы мільярды, — усміхаецца ён. — Мне асабіста падабаецца выказванне пра старога яўрэя, які страціў вялікую суму грошай і дзякаваў Богу за тое, што ўзяў грашыма. Мараль зразумелая. За ўсё ў жыцці трэба плаціць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара і з архіва іерэя Сергія ГУСАРА.**

На слыху

# ЗА МЯЖОЙ НАХАБСТВА

## Грамадзяне атрымліваюць ліпавыя павесткі ў армію

**Як паведамілі ў Міністэрстве абароны, чарговую няўдалую спробу раскачаць грамадства распачалі фэйкамётчыкі, якія спрабуюць спекуляваць на гэтай тэме. Цяпер яны не прыдумалі нічога лепшага, чым «напалохаць» беларусаў ілжывымі павесткамі аб мабілізацыі.**

«Пры гэтым пільныя грамадзяне самі прынеслі «намаляваны» ілжэдакумент у Міністэрства абароны, — паведамляецца на афіцыйным акаўнце абароннага ведамства. — Беларусы нават не патрабавалі тлумачэнняў, бо даваряюць афіцыйным крыніцам інфармацыі, у якіх неаднаразова заяўлялася аб тым, што ніякіх мерапрыемстваў мабілізацыі ва Узброеных Сілах не праводзіцца, а ўсе павесткі інфармуюць аб раней запланаваных зборах».

Як акцэнтавалі ўвагу ў Мінабароны, сапраўдныя павесткі не маюць нумарацыі, завяраюцца гербавай пячаткай, а ў тэксце павесткі ўказваюцца спасылкі на існуючыя нарматыўныя прававыя акты. Акрамя таго, дакумент, у якім паведамляецца з'явіцца ў ваенкамат, мае абсалютна іншую форму ўсталяванага бланка.

Выпадак уручэння ваеннаабавязанаму псеўдапавесткі быў зафіксаваны і ў Кастрычніцкім раёне сталіцы. Як высветлілі ў ваенным камісарыяце, дадзеная павестка не адпавядае ўстаноўленым патрабаванням і аформлена неналежным чынам. Грамадзянін, які яе атрымаў, у ваенны камісарыят не выклікаўся: ні на зверку ўліковых даных, ні на ваенныя зборы.

Як паведаміў **ваенны камісар Кастрычніцкага раёна Мінска Яўген БРАЦКОЎ,** грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія знаходзяцца ў запасе, а таксама грамадзяне прызыўнога ўзросту выклікаюцца на адпаведныя мерапрыемствы павесткамі, формы якіх вызначаны дзеючай нарматыўнай базай, іх узоры ўстаноўлены адпаведнымі дакументамі. «У выпадку, калі грамадзянін сумняваецца ў сапраўднасці дадзенай павесткі і выкліку, ён мае права патэлефанаваць у ваенны камісарыят і ўдакладніць інфармацыю, калі выклікаецца, да якога часу і на якое мерапрыемства», — заўважыў ваенкам.

Заканадаўствам Рэспублікі Беларусь прадугледжана ўручэнне грамадзяніну павесткі як асабіста пад роспіс, так і пры дапамозе кіраўнікоў дзяржаўных органаў, арганізацый, а таксама праз аддзяленні паштовай сувязі. «Цяпер ваенны камісарыят выконвае планавыя мерапрыемствы, у тым ліку праводзіцца выклік ваеннаабавязаных для зверкі ўліковых даных, праходжання планавага медыцынскага пераагляду, ажыццяўляецца адбор ваеннаабавязаных для праходжання ваенных збораў у планавым парадку, — падкрэсліў Яўген Брацкоў. — Акрамя таго, ажыццяўляюцца мерапрыемствы прызыву на падставе дзеючага заканадаўства, гэта значыць, Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб звальненні ў запас і прызыве на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве».

Нагадаем, за фэйкавыя павесткі прадугледжана пакаранне. «Калі гэта чыйсьці няўдалы жарт, то ён абернецца для грамадзяніна або групы асоб адказнасцю ў адпаведнасці з дзеючым крымінальным заканадаўствам, — акцэнтаваў увагу ваенны камісар. — Дадзеныя грамадзяне ў любым выпадку будуць знойдзены і прыцягнуты да адказнасці».

**Вераніка КАНЮТА.**

Гучная справа

# СЯРОД ПАДАЗРАВАНЫХ — ДЗЕЦІ

## Праваахоўнікі спынілі дзейнасць трансгранічнай злачыннай групы, якая займалася лжэмініраваннем

**На працягу апошніх двух гадоў, а таксама некалькіх месяцаў бягучага зламыснікі накіроўвалі ў розныя ўстановы, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі і іншых краін, загадзя ілжывыя паведамленні аб небяспецы. Аб'ектамі «мінёраў», як правіла, станавіліся школы, прадпрыемствы, сацыяльная інфраструктура, забаўляльныя і гандлёвыя цэнтры, вакзалы і аэрапорты.**

Галоўным упраўленнем па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці Міністэрства ўнутраных спраў сумесна з калегамі з Брэста, Віцебска і Мінска, а таксама пры садзейнічанні Камітэта дзяржаўнай бяспекі, пры падтрымцы расійскіх калег, у прыватнасці Галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні экстрэмізму МУС і Федэральнай службы бяспекі, была спынена дзейнасць міжнароднай злачыннай групы так званых сватараў. Апошнія актыўна публікавалі ў тэлеграм-каналах навіны, у якіх паведамлялі аб фактах здзейсненых імі «мініраванняў».

— Усё пачыналася з дзіцячага свавольства, — паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці МУС палкоўнік міліцыі Андрэй КАВАЛЁЎ.** — Група «мініравала» пэўны аб'ект або асобу, якая па сваіх палітычных або дзяржаўных поглядах не была згодная з той ці іншай групай у арганізацыі. Зламыснікі атрымлівалі за гэта грашовае ўзнагароджванне. Ролі былі падзелены, усё было спланавана. Працягла час злачынцам удавалася пазбегнуць пакарання. Справа ў тым, што людзі выкарыстоўвалі ананімныя паштовыя рэсурсы, якія дазвалялі на працягу доўгіх гадоў ананімна, як яны думалі, пакідаць паведамленні або ажыццяўляць веернае рассыланне. У розныя дзяржаўныя органы паступала адно і тое ж паведамленне аб тым, што закладзена выбуховае прыстасаванне, неабходна або выплаціць пэўную грашовую суму, або выпусціць якіх-небудзь зняволеных, затрыманых.

Па падазрэнні ў ілжывых мініраваннях у нашай краіне затрыманы два чалавекі. Адзін з іх падазраецца ў арганізацыі злачынстваў. У цяперашні час на тэрыторыях дзвюх краін (у Расіі — больш чым у 10 акругах) працягваюцца аператыўна-следчыя дзеянні па ўстанаўленні ўсіх удзельнікаў злачыннай групы і фіксацыі лічбавых слядоў іх дзейнасці. Па інфармацыі МУС, затрыманыя ідуць на кантакт з праваахоўнікамі, удзельнікі даюць прызнальныя паказанні.

Як адзначыў начальнік галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці МУС, гэта непаўналетнія. «На момант злачыннай дзейнасці яны ўжо дасягнулі ўзросту прыцягнення да крымінальнай адказнасці, — заўважыў Андрэй Кавалёў. — Сёння старэйшаму з іх 15 гадоў. Дзеці забываюць, што часта гульні перарастаюць у дарослае жыццё, яны становяцца падазраванымі асобамі, у адносінах да якіх узбуджаюцца крымінальныя справы. Гэта так званая трансгранічная нацыянальная злачыннасць, добра арганізаваная і спланаваная. Безумоўна, за ўсім гэтым стаіць карысць: усё пачыналася з дзіцячага свавольства, якое перарасло ў атрыманне прыбытку. На сёння ім пагражае да пяці гадоў пазбаўлення волі. Калі Следчым камітэтам будзе прынята рашэнне аб перакваліфікацыі крымінальнай справы — да сямі гадоў. У той жа час разглядаецца пытанне і аб арганізаванай міжнароднай злачыннай групе.




**Фрагмент перапіскі арганізатараў ілжывых мініраванняў.**

Таму, калі будзе ўзбуджана справа па артыкуле «Тэрарызм», прадугледжана ажно да 20 гадоў пазбаўлення волі».

**Вераніка КАНЮТА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жатерево» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:**

**ЗДАНИЯ ПИЛОРАМЫ**

***(составные части и принадлежности: вход в подполье)***

**с инвентарным номером № 622/С-42992 общей площадью 352,2 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625481302101000152 (право аренды по 19.05.2063) площадью 0,1984 га по адресу: Минская область, Столбцовский район, Вишневецкий с/с, аг. Горки, ул. Первомайская, 2В.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **14 140,03** бел. руб.

*Начальная цена снижена на 50 %.*

Задаток 10 % от начальной цены – **1 414,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB 30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере: 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 30.07.2021, 11.01.2022.

Аукцион состоится **23.03.2022** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.03.2022** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11. Тел. для осмотра (8029) 138-01-12.**

УНН 600014432



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкая фабрика пошива одежды» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**

- **изолированное помещение с инв. № 640/D-50250 (наименование – гараж) общ. пл. 23,4 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3/4-2;**
- **изолированное помещение с инв. № 640/D-50251 (наименование – склад с бытовым помещение), общ. пл. 265,1 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3/4-1;**
- **изолированное помещение с инв. № 640/D-50249 (наименование – склад), общ. пл. 65,1 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3/4-4;**
- **капитальное строение с инв. № 640/С-27199 (наименование – швейно-массовый цех)** *(составные части и принадлежности: 4 пристройки, уборная)*, **общ. пл. 880 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б/3;**
- **капитальное строение с инв. № 640/С-27204 (наименование – проходная), общ. пл. 9 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б;**
- **капитальное строение с инв. № 640/С-114516 (наименование – гараж), общ. пл. 108,1 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б/2.**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 624650100001000065** ***(право аренды по 07.04.2041)*** **площадью 0,7264 га по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б.**

*Земельный участок имеет ограничения прав: охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, 0,0832 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **172 869,55** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **17 286,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **12.04.2022** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.04.2022** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: 8 (017) 956 36 00, 8 (029) 370 56 01.**

УНН 600154407



ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

**Государственным предприятием**

**«БелЮрОбеспечение»**

**назначено проведение электронных торгов по поручению ОАО «Могилевхлебопродукт»:**

**Лот № 9.2022.04.00004:** квартира с инв. № 700/D-9916, площадью 65,1 кв. м, начальной стоимостью 145 680,00 бел. руб. с НДС, находящееся в г. Могилев, пр-т Мира, 1-62.

**Лот № 9.2022.04.00006:** магазин «Колос-10» с инв. № 700/С-90653, площадью 92,9 кв. м, начальной стоимостью 102 000,00 бел. руб. с НДС, находящееся в г. Могилев, ул. Краснозвездная, 58а.

Торги пройдут **14.04.2022 с 9.00 до 18.00** на ЭТП **e-auction.by** согласно Регламенту ЭТП (размещен на сайте e-auction.by, раздел «Информация»). Задаток – 10 % от стоимости лота зачисляется в срок до 16.00 13.04.2022

Подробная информация на сайте **e-auction.by** в разделе «Аукционы».

УНП 192821149



**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ**

**по жилому дому № 2 по генплану в составе объекта «Комплексная застройка жилого квартала № 5 в микрорайоне «Сокол» в г. Минске»,**

***опубликованную в газете «Звязда» № 47 (29669) от 10.03.2022 г.***

**Сведения о застройщике:** коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» зарегистрировано Мингорисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 05.01.2015 за № 192400611.

**Юридический адрес и местонахождение предприятия:** 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 4-107, тел./факс (017) 234-16-99.

Стоимость 1 кв. м общей площади объекта долевого строительства в текущих ценах с учетом прогнозных индексов для сверхнормативной площади – **2 200,00 белорусских рублей**.

УНП 192400611



Утерянный представительством Белгосстраха по Крупскому району страховой полис добровольное страхование от несчастных случаев и заболеваний (форма 2РП/2РН) серия БН № 1180223 в количестве 1 (одна) штука **считать недействительным.** УНП 100122726

# ЯКАСЦЬ АДУКАЦЫІ, ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ...

## СУПРАВАДЖЭННЕ АДОРАНАЙ МОЛАДЗІ

Кіраўнік галіны канстатаваў, што ў мінулым годзе было зроблена шмат, аднак праблем, якія стаяць перад сістэмай адукацыі і патрабуюць свайго вырашэння, таксама хапае. Па словах міністра, у краіне наладжана сістэмная работа па пошуку і падтрымцы таленавітых школьнікаў і моладзі. Дзейнічае савет спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Развіццё школьнага алімпіяднага руху таксама з'яўляецца магутным фактарам выяўлення і станаўлення таленавітай моладзі.

У 2021 годзе ў міжнародных алімпіядах па вучэбных дысцыплінах прынялі ўдзел 103 беларускія школьнікі, 89 з іх былі ўзнагароджаны медалямі рознай вартасці. Больш за 1600 навучэнцаў прынялі ўдзел у заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах. «Нам нельга выпускаць з поля зроку тых, хто займае прызавыя месцы, і тых, хто праходзіць доўгі шлях падрыхтоўкі і ўдзелу ў інтэлектуальных спаборніцтвах. Менавіта яны будуць студэнтамі нашых універсітэтаў і каледжаў. Мы значна недапрацоўваем у суправаджэнні адоранай моладзі на ўсіх узроўнях адукацыі», — лічыць міністр.

Новай формай уключэння адораных навучэнцаў у інтэлектуальна-пазнавальную дзейнасць з'яўляецца функцыянаванне Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка. «Каб развіваць гэты кірунак, неабходна праяўляць вялікую зацікаўленасць ва ўмацаванні сувязяў з вядучымі навукоўцамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Неабходна канчаткова выбудаваць сістэму работы па выяўленні і суправаджэнні адораных дзяцей і моладзі, у тым ліку праз дзейнасць рэгіянальных апорных устаноў адукацыі, саветаў маладых вучоных устаноў вышэйшай адукацыі. Наспела неабходнасць стварэння навукова-адукацыйнага кластара па рабоце ўсіх устаноў адукацыі з адоранай моладдзю», — падкрэсліў Андрэй Іванец.

Што датычыцца арганізацыі профільнага навучання на старшай ступені школы, то яно павінна матываваць падлеткаў на атрыманне прафесій, якія запатрабаваны ў рэальным сектары эканомікі і ў канкрэтным рэгіёне. Ідучы ў дзясяты клас, навучэнец павінен ведаць сваю далейшую адукацыйную траекторыю пасля заканчэння сярэдняй школы.

## ЛІЦЭЙСКАЯ АДУКАЦЫЯ — НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ ГАРАДЖАН

З 2022 года, як заўважыў Андрэй Іванец, змяняецца парадак паступлення ў агульнаадукацыйныя ліцэі і патрабаванні да іх дзейнасці. І гэта інфармацыя павінна быць даведзена да ўсіх зацікаўленых, патрабуецца правесці сярод навучэнцаў і іх бацькоў адпаведную тлумачальную работу.

Цяпер абавязковая ўмова для функцыянавання ліцэяў — забеспячэнне магчымасці навучацца ў іх дзецям з любога кутка краіны. **Дырэктар Ліцэя Наваполацка Ірына ДЗЕМЕНКАВЕЦ** канстатавала ў сваім выступленні, што неабходнасць стварэння ўмоў для пражывання і вучобы іншагародніх навучэнцаў стала адным з самых «гарачых пытанняў», што абмяркоўваліся пасля праведзенага па краіне маніторынгу дзейнасці ліцэяў. Сёння ва ўстанове адукацыі, якую яна ўзначальвае, у 10-11 класах навучаюцца 220 падлеткаў. Пераважная большасць з іх — жыхары Наваполацка і Полацка, але з кожным годам расце запатрабаванасць ліцэя навучэнцамі з Полацкага, Ушацкага, Лепельскага, Мёрскага, Глыбоцкага, Верхнядзвінскага, Расонскага раёнаў. Дзякуючы «сарафаннаму радыё», у наваполацкі ліцэй прыехаў вучыцца нават юнак з Магілёўскай вобласці.

«Я лічу, што ў ліцэях аднаназначна павінны быць створаны ўмовы для пражывання высокаматываваных навучэнцаў з сельскай мясцовасці, — падкрэсліла Ірына Дземенкавец, — таму што ў сельскіх населеных пунктах часта функцыянуюць толькі пачатковыя і базавыя школы, а вось высокакваліфікаваныя кадры, якія могуць забяспечыць на старшай ступені школы вывучэнне прадметаў на павышаным узроўні, на жаль, не заўсёды там ёсць. Сумесна з ААТ «Нафтан» у нашай установе адукацыі вырашана пытанне з забеспячэннем іншагародніх навучэнцаў месцамі ў інтэрнаце. Другім момантам, які актыўна абмяркоўваўся, стаў мінімальны парог на ўступных іспытах пры ўдзеле ў конкурсе на залічэнне. Я ўпэўнена, што адбор навучэнцаў пры ўмове атрымання на экзамене адзнакі ў шэсць балаў і вышэй стане дадатковым рэсурсам у забеспячэнні высокай якасці адукацыі. З нашых выпускнікоў летась 92 працэнты сталі студэнтамі ВНУ, але ёсць хлопцы і дзяўчаты, якія свядома выбіраюць узровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі, і мы падтрымліваем іх рашэнне».

Ірына Дземенкавец паведаміла, што з 2020 года ліцэй удзельнічае ў рэалізацыі рэспубліканскага эксперыментальнага праекта па апрабацыі эксперыментальных інтэграваных навучальных планаў і вучэбных праграм ва ўмовах абноўленага зместу дапрофільнай падрыхтоўкі і профільнага навучання. Гэта дазволіла павялічыць колькасць гадзін на вывучэнне прадметаў на павышаным узроўні, зрабіць акцэнты ў навучанні на фарміраванне ўменняў прымяняць свае веды ў рэальных жыццёвых сітуацыях.

**Сучасны старшакласнік хоча разумець, навошта яму патрэбныя канкрэтныя веды і як яны будуць запатрабаваныя ў жыцці. Якасць адукацыі і яе эфектыўнасць у вялікай ступені залежыць ад прафесійных характарыстык педагагічнага калектыву.**


Фота БелТА.

«Абноўленыя вучэбныя праграмы раскрываюць узаемасувязь паміж асобнымі вучэбнымі прадметамі, умацоўваюць сувязь тэорыі з практыкай, адпавядаюць узроставым магчымасцям навучэнцаў і спрыяюць іх прафесійнай арыентацыі. Нягледзячы на тое, што ў бягучым вучэбным годзе пераход школы на новыя вучэбныя праграмы быў завершаны, спыняцца ў пытаннях удасканалення зместу адукацыі нельга, таму што агульная сярэдняя адукацыя, як асноўны ўзровень адукацыі, павінна забяспечыць развіццё сістэмы адукацыі ў рэчышчы вядучых міжнародных тэндэнцый, звязаных з фарміраваннем у навучэнцаў функцыянальнай адукаванасці і навыкаў XXI стагоддзя, неабходных кожнаму чалавеку для асобаснага развіцця і самарэалізацыі, сацыяльнай уключанасці і паспяховасці, — падкрэсліла дырэктар ліцэя Наваполацка. — Сучасны старшакласнік хоча разумець, навошта яму патрэбныя канкрэтныя веды і як яны будуць запатрабаваны ў жыцці. Якасць адукацыі і яе эфектыўнасць у вялікай ступені залежыць ад прафесійных характарыстык педагагічнага калектыву, яго кваліфікацыі, досведу, гатоўнасці ўспрымацьнававядзенні. Акрамя настаўнікаў-прадметнікаў, у ліцэі працуюць пяць выхавальнікаў. Увесці іх у штатны расклад мы змаглі дзякуючы шчыльнаму ўзаемадзеянню з Наваполацкім гарадскім выканаўчым камітэтам. Такі падыход выводзіць на якасна іншы ўзровень выхаваўчую работу з моладдзю, павышае яе эфектыўнасць і дазваляе забяспечыць індывідуальны падыход да кожнага навучэнца».

## НОВЫ СПЕЦЫЯЛІСТ У ШКОЛЕ

Як адзначыў у сваім выступленні на калегіі **начальнік аддзела па адукацыі Брэсцкага гарадскога выканаўчага камітэта Анатоль НАСКОЎ**, патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення ў школах заўсёды было ў прыярытэце.

— Міністэрствам адукацыі праведзена вялікая работа, каб вывесці дадзены кірунак на якасна новы ўзровень. Так, з 1 верасня ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі была ўведзена новая пасада — кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні. Органамі кіравання адукацыі Брэста і Брэсцкай вобласці адразу распачалася работа па падборы і расстаноўцы адпаведных кадраў. Значную дапамогу аказалі Брэсцкі абласны ваенны камісарыят і яго структурныя падраздзяленні, грамадскае аб'яднанне «ДАСААФ», Беларускі саюз афіцэраў і Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане, — расказаў Анатоль Наскоў. — Якая ж кадравая сітуацыя складваецца на Брэстчыне сёння? У 409 установах адукацыі ўведзена 292,5 штатных пасад кіраўнікоў па ваенна-патрыятычным выхаванні. Па стане на сакавік 2022 года запоўнена больш як 226 ставак (іх займае 351 работнік), а вакантнымі застаецца больш як 67 ставак, або 23 працэнты ад агульнай колькасці. Стаўкі дзеляцца, а гэта не вельмі добра. Другая праблема — неадпаведнасць патэнцыяльных кандыдатаў на вакантныя пасады кваліфікацыйным патрабаванням. Ад прэтэндэнтаў патрабуюцца наяўнасць вопыту службы ва Узброеных сілах і іншых сілавых ведамствах плюс наяўнасць у іх педагагічнай адукацыі. Часта канкрэтны кандыдат, які з'яўляецца афіцэрам запасу або афіцэрам у адстаўцы, не гатовы працаваць з дзецьмі. Сітуацыю неабходна мяняць.

У 2021 годзе Брэсцкім абласным інстытутам развіцця адукацыі былі арганізаваны курсы павышэння кваліфікацыі для 74 чалавек. На 2022 год запланавана ахапіць курсамі павышэння кваліфікацыі больш як 150 работнікаў. Праведзена 98 метадычных семінараў, у кожным рэгіёне ў вобласці створаны метадычныя аб'яднанні кіраўнікоў па ваенна-патрыятычным выхаванні.

«Згаданыя спецыялісты маюць вопыт ваеннай службы за плячыма, што з'яўляецца прыкладам для навучэнцаў і адначасова папулярызуе прафесію ваеннаслужачага, — упэўнена кажа Анатоль Наскоў. — Акрамя таго, кантроль за бяспекай навучэнцаў ва ўстановах адукацыі акумулюецца цяпер у руках прафесіянала, што ў сучасных умовах таксама вельмі важна. А ў супрацоўніцтве з зацікаўленымі ведамствамі з'яўляецца магчымасць арганізацыі новых, найбольш эфектыўных форм рэалізацыі ваенна-патрыятычнага выхавання. Сваю найбліжэйшую задачу мы бачым у стапрацэнтным запаўненні вакансій кіраўнікоў па ваенна-патрыятычным выхаванні з максімальным прыцягненнем на гэтую пасаду афіцэраў запасу і афіцэраў у адстаўцы. Дзякуючы ім, на якасна новым узроўні арганізоўваецца работа па ўзаемадзеянні навучальных устаноў з камандзірамі вайсковых часцей і падраздзяленняў, начальнікамі ваенных факультэтаў і ваенных кафедраў, суправаджаецца дзейнасць факультатываў ваенна-патрыятычнай накіраванасці. У Брэсце сфарміравана і пастаянна пашыраецца сетка такіх факультатываў. Яны працуюць на базе васьмі ўстаноў адукацыі, імі ахоплена 1225 навучэнцаў 5—11 класаў».

**Што датычыцца арганізацыі профільнага навучання на старшай ступені школы, то яно павінна матываваць падлеткаў на атрыманне прафесій, якія запатрабаваны ў рэальным сектары эканомікі і ў канкрэтным рэгіёне.**

Анатоль Наскоў праінфармаваў, што ў Брэсцкай вобласці зараз дзейнічае 85 пошукава-даследчых клубаў на базе ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а вось стварэнне дзіцячых аб'яднанняў па інтарэсах разам з вайсковымі часцямі — новы кірунак у рабоце. Галоўная мэта такіх аб'яднанняў — маральнае, ваенна-патрыятычнае, фізічнае выхаванне моладзі, фарміраванне ў падрастаючага пакалення патрыятычнай свядомасці, пачуцця вернасці Радзіме, гатоўнасці да выканання задач па абароне Айчыны і авалоданне неабходнымі для гэтага ведамі, уменнямі і навыкамі. За апошні час у Брэсцкай вобласці пры падтрымцы МУС былі створаны два такія клубы: «Патрыёт» у Баранавічах і «Крэпасць» у Брэсце.

«Дадзеная форма работы перспектыўная і нам трэба актывізаваць узаемадзеянне з часцямі і падраздзяленнямі ўсіх сілавых ведамстваў. Але для арганізацыі сістэмнай работы ў гэтым кірунку трэба паскорыць з'яўленне нарматыўнага дакумента, які будзе рэгламентаваць работу такіх клубаў», — дадаў начальнік аддзела па адукацыі Брэсцкага гарвыканкама.

Надзея НІКАЛАЕВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нясумнае чытанне

# «НАДА МНОЮ — КРЫЛЫ БЕЛЫМ ДАХАМ...»

**Улюбёныя птушкі беларускіх паэтаў**

**ПТУШКІ заўсёды вяртаюцца з выраю... Як бы ні было цёпла ды ўтульна ў далёкіх краінах. І наша веснавое неба зноў перакрэсліваюць птушыныя кліны, што вяртаюцца на свае палеткі.**

**Птаства — улюбёная сімволіка і ў фальклоры, і ў літаратуры... «А ў перапёлачкі ножкі баляць», «Гэй, саколе..», «Ляцэла зязюля» — лунае спеў... Пяшчотна сутыкаюцца дзюбкамі галубы на вышываных ручніках, пагойдваюцца на нітках саламяныя жаўронкі, ахоўваючы хату... «Птушкі і гнёзды» — назваў народны пісьменнік Янка Брыль сваю эпапею пра лёс беларусаў. Давайце ў час, калі мы сустракаем крылатых сяброў, згадаем, якіх птушак найбольш любілі беларускія літаратары.**

## БУСЕЛ

«Зараз вясна. Над усёй нашай краінай, наставіўшы белыя ветразі крылаў, планіруюць буслы. Іх многія і многія тысячы — хто лічыў? На вільчыках сялянскіх хат, на дрэвах, на калонах старых разбураных палацаў, на слупах капліц сярод маладога зялёнага жыта. Гнёзды паўсюль. І таму мне здаецца, што ў гэтым — і не толькі ў гэтым — дні зямлю нашу, Беларусь, можна назваць «зямлёю пад белымі крыламі», — пісаў Уладзімір Караткевіч ва ўступным слове да свайго культавага эсэ.

Колькі прыдумана ды напісвана пра даўгадзюбых нашых суседзяў! Рыгор Барадулін прысвяціў свайму сябру Васілю Быкаву верш «Бусел», у якім гэты птах пераўтвараецца ў птушку шчасця:

*«Непаседа,*
*даўгацыбы бусел —*
*Даўняе вясны забыты сон.*
*...Я злавіць яго*
*за хвост цягнуся,*
*Дражніцца і уцякае ён.*
*От, здаецца, ушчамлю пад паху*
*(Лугавінаю бягу наўпрост).*
*Нада мною — крылы белым дахам,*
*А перад мною — чорны хвост...»*

Вядома, у жыцці лавіць буслоў за хвост непажадана, а каб малечы больш даведаліся пра іх, набудзьце кнігу з серыі выдавецтва «Мастацкая літаратура» «Нашы сімвалы» пад назвай «Буслава айчына».

## ЗЯЗЮЛЯ

Аказваецца, шэрая птушка, якая адлічвае нам гады — «дальні мігрант». То-бок адлятае зімаваць дужа далёка, у якуюсь Афрыку... Вось толькі ляціць паасобку, не чарадой. А легендаў пра яе існуе... Звычайна ў зязюлю ў казках ды песнях ператвараюцца пакрыўджаныя ды абражаныя. А вось у вершы Уладзіміра Караткевіча гэтая птушка цалкам аптымістычная:

*«Закувала зязюля ў лесе*
*празрыста-зялёным...*
*Божа мой! Колькі год яшчэ жыць*
*нам з табою і жыць!*
*Ранак ціхай вясны! Ранак светлых*
*пяшчотных палонаў!*
*Ранак вечных спатканняў на роснай і цёплай,*
*пахучай мяжы!*
*І не будзе канца ні вясне,*
*ні іскрыстай расе,*
*ні каханню,*
*І спрадвеку, давеку, магутныя,*
*будуць яны*
*Цараваць над вясенняй зямлёй,*
*над гаямі у цёплым*
*тумане,*
*Над гаямі, дзе...*
*Так нечакана прыгасла зязюлі*
*куванне.*
*Дзе ля касак прабітых мігцяюць*
*калматымі веямі сны».*

У Канстанцыі Буйло лічэнне зязюляю гадоў мае зусім іншую эмацыянальную афарбоўку:

*«Не кукуй, зязюля, каля майго*
*дому!*
*Шчасця год — тут болей не лічы нікому.*
*Ты ляці, зязюля, ў гай ляці зялёны,*
*Дзе хістаюць дрэвы пышныя кароны,*
*Дзе спакой і ціша у духмяным ценю,*
*Дзе скрозь лісце ніжа сонейка праменні.*
*Не будзі ты суму адзінокай хаты,*
*Адляцеў далёка сокал мой крылаты...*
*Слёз ён не убачыць, жалю не утуліць...*
*Не кукуй ля дома гэтага, зязюля».*

Верш напісаны ў 1934 годзе. У 1933-м быў арыштаваны муж паэткі, Віталь Калечыц, на час напісання ён быў у Дальлагу пад Хабараўскам. Гэта яго паэтка называе ў вершы сокалам...



## СОКАЛ

Гэтак жа, як каханых жанчын называлі ластаўкамі, каханых мужчын параўноўвалі з сокаламі. Але сокаламі называлі яшчэ мужных ды смелых...

*«Падымайся з нізін, сакаліна сям'я,*
*Над крыжамі бацькоў, над нягодамі;*
*Занімай, Беларусь маладая мая,*
*Свой пачэсны пасад між народамі!..»* — заклікаў Янка Купала ў дарэвалюцыйным вершы...

*«І вецер, і сокал, і я —*
*Сыны адной долі-жыцця,*
*Наводзім маркотныя мы*
*І думы і песні адны»,* —

прызнаваўся ён жа.

А апавяданні Аляксея Кулакоўскага «Белы сокал» насамрэч пра... каня. Сокалам звалі ўлюбёнага каня чырвонаармейца, і цяпер белы конь, падобны да таго Сокала, дапамагае герою падчас вайны наведаць эвакуіраваную жонку і яшчэ не бачанага маленькага сына.

У вершы Максіма Танка, напісанага ў 1938 годзе ў Заходняй Беларусі, маці над калыскай пяе сыну: «Мутна гаснуць асеннія дні, ой, не плач ты, мой сокал, засні!» і згадвае мужа, які сядзіць у астрозе.

## ПЕРАПЁЛКА

Самы вядомы твор беларускай літаратуры, звязаны з вобразам гэтай сціплай птушкі, — «Плач перапёлкі» Івана Чыгрынава. Лёс перапёлкі, што страціла сваё гняздо, параўноўваецца з лёсам беларусаў, якія пацярпелі ад фашысцкіх акупантаў. Галоўны герой Зазыба, трывожачыся, ці не нападуць на іх сяло немцы, слухае голас перапёлкі ў жыце:

*«— Піць-піль-віць... Піць-піль-віць...*

*У ім не было тае ядранай і бесклапотнай зухаватасці, якая, быццам удар хлыстоўскі, ажно падсцёбвае часам і прыўзнімае настрой.*

*— Піць-піль-віць... Піць-піль-віць...*

*Сёння перапёлка, няйначай, плакала — ці то гняздзечка яе разбурыў хто, ці яшчэ якая бяда прымусіла агалошваць тугой наваколле, але замест звычайнага спеву чуўся плач:*

*— Піць-піль-віць... Піць-піль-віць...*

*Зазыба нарэшце адчуў гэта, і ў галаве ягонай узнікла пакутлівая думка: калі птушкі так плачуць са свайго гора, то як жа тады павінны галасіць людзі, у якіх гора наогул бывае незраўнана больш, а цяпер дык і зусім цераз край?»*

Успомнілася:

*Перапёлка, трасцяно гняздзечка,*
*залато яечка,*
*перапёлка!*
*Перапёлка, пастушкі пагоняць,*
*гняздзечка разбураць,*
*перапёлка!»*

Вобраз перапёлчынага плачу замацаваўся ў літаратуры. Яўгенія Янішчыц так пісала пра сваю малую радзіму:

*«Там перапёлка плача,*
*Агні рабін гараць.*
*Там крэўная задача —*
*Пасеяць і сабраць».*

## ВЕРАБЕЙ

Птушачка, якая ніколі нас не пакідае, застаюцца нават у самыя маразы ў беларускіх вёсках ды мястэчках, таксама трывала прапісалася ў беларускім фальклоры і літаратуры. У 1957 годзе ў лютаўскім нумары часопіса «Беларусь» быў апублікаваны верш Францішка Багушэвіча «Верабей і каша», перакладзены заходнебеларускім паэтам Міхасём Машарам. Багушэвіч напісаў твор напрыканцы XIX стагоддзя на польскай мове... Чым жа ён зацікавіў Міхася Машару?



*«Змяніўся час... Калі жыццё прасочым,*
*Убачым, што да горшага ўсё крочым.*
*Вось птушкі... вераб'і, напрыклад...*
*Спрадвеку верабей, як звыкла,*
*Кляваў адну толькі пшаніцу!*
*А сёння вось, як бачаць вочы нашы,*
*Жывіцца ён адной грачанай кашай.*
*Ох, дрэнны час! Ён гэта чуе,*
*Аднак за морам ежы не шукае,*
*Затое пад сваёй страхой начуе, —*
*Жыццёвы сэнс на гэтым палягае!*
*Пшаніца змерзла сёння наша,*
*Адна грачаная ў нас каша,*
*Але з жалеза, нат стальная,*
*Яна, як сталь, нас загартуе.*
*Нас гэта каша захавае,*
*Не змогуць з'есці нас...*
*Мы гэта знаем,*
*Яна ад іх нас уратуе».*

І для Машары, які змагаўся за беларушчыну пад уладай панскай Польшы, і для Францішка Багушэвіча, які адстойваў правы беларусаў на сваю мову і культуру ў часы царызму, верабейчык стаў сімвалам вернасці радзіме ў самыя чорныя часы.

Вядома, верабей — улюбёны герой літаратуры для дзяцей... У паэме Максіма Танка ён — добры сем'янін, угаворвае вярбу пакалыхаць яго дзетак, у казцы Уладзіміра Караткевіча — гарэзлівы і нават хуліганісты:

*«Хадзіў сабе і спяваў:*
*Я — вясёлы верабей,*
*Я — арол-верабей...»*

## САЛАВЕЙ

У аповесці Змітрака Бядулі «Салавей» крылаты спявак робіцца сімвалам вольнага мастацтва.

*«Салоўка спявае.*

*Ці варта чапаць гэту маленькую шэрую птушачку?*

*Яна сваімі спевамі давала натхненне (як даўней гаварылі) песнярам усіх краёў зямлі.*

*Пакаленне за пакаленнем ткала шматмільённую плахту вякоў, а салоўка ўсё спяваў ды спяваў, дыктаваў вершы рамантычна настроеным юнакам. Істужкаю гэтых вершаў можна аплятаць галу зямлі, як гліняны гляк дротам. Калі не верыце — паспрабуйце!»*

Герой аповесці, прыгонны хлопец атрымлівае мянушку «Салавей» за тое, што ўмее пераймаць спевы гэтай птушачкі... Хлопец здолеў вырвацца на волю. Пра мастака і волю — і верш Алеся Гаруна «Салавейка»:

*«Салавейку узялі ды з гаю*
*Пасадзілі ў клетку за краты.*
*У маю*
*Тэй страты*
*Найцяжэйшай дазнаў салаўюшка.*

*Распусціўся лісток на дубочку,*
*Апранулась зямелька ў краскі;*
*А ў ночку,*
*А з ласкі,*
*Не спявае ніхто над рачушкай.*

*Ой, чаму ж, салавейка, ты болі*
*Чараўнічых спявоў не счынаеш?*
*Што волі*
*Не маеш*
*І спяваці ні будзеш ніколі?»*

Пад вершам стаяць дзве даты — 1907 і 1914. Яны невыпадковыя. 4 сакавіка 1907-га малады паэт быў арыштаваны ў падпольнай друкарні на вуліцы Шырокай у Мінску, дзе ў той момант друкавалася адозва «Да ўсіх працоўных», яго асудзілі на высылку і пажыццёвае пасяленне ў Сібіры. У 1914-м Гарун адаслаў з Сібіры ў Вільню рукапіс свайго першага зборніка «Матчын дар», у якім быў і гэты верш.

Згадваў салаўя ў вершы «Груган і салавей» Янка Купала:

*«Груган, сустрэўшы салаўя,*
*З сваяцтвам лезці стаў к таму:*
*«Ты родны мне, як бачу я, —*
*Хадзі ж, як брата абыму!»*

Салавей, аднак, слушна адказаў, што груган, нават пры наяўнасці дзюбы, яму не радня.

*«Самыя вясёлыя і галасістыя*
*салаўі —*
*на вясковых могілках.*
*Напэўна, таму,*
*што і днююць, і начуюць*
*не ў гнёздах,*
*а ў душах маіх спрахлых дзядоў.*
*Яны ж, як сведчыць тутэйшы народ, былі самымі жыццярадаснымі і жартаўлівымі людзьмі на Палессі»,* — так сцвярджаў Анатоль Сыс.

## ЖАЎРАНАК

Любяць беларусы і светлую птушку — жаўрука.

*«Пачую, як жаўрук спявае, —*
*І я хлапчук вясковы зноў.*
*Мая сцяжынка палявая*
*Рассоўвае сцяну жытоў»,* — настальгаваў Пятрусь Макаль.

*«Жаўранка, жаўранка, пташачка вольная,*
*Дзетка шчаслівая волі святой,*
*Доляй прастору і свету бязмежнага*
*Душу пакутную мне ты напой»,* — пісаў рэвалюцыянер Цішка Гартны ў 1912 годзе.

Але самы пранізлівы, самы ўзнёслы верш пра гэтую птушку стварыў Уладзімір Караткевіч:

*«Хмары веснія цяжкія, як кентаўры,*
*Песня шчасця пад імі ўзахлёб звініць.*
*Ах, гэта жаўранак,*
*Жаўранак,*
*Жаўранак,*
*Срэбная,*
*Срэбная,*
*Срэбная ніць.*
*Над ракою, тваім зайздросцячы лаўрам,*
*Вадзяны бугай трубіць,*
*як грубіць.*
*Не звяртай увагі,*
*Жаўранак,*
*Жаўранак,*
*Не парві сваю тонкую,*
*Тонкую ніць.*
*Зноў дымеюць разоры і сытая*
*пара*
*На курганы былога майго бяжыць.*
*Працягні з майго сэрца,*
*Жаўранак,*
*Жаўранак,*
*Аж да самага неба*
*Звонкую ніць».*

Пра вялікую пашану беларусаў да гэтай сонечнай птушкі згадаў і Анатоль Сыс:

*«Без мяне прарастуць*
*у зямлю жаўруковыя гнёзды,*
*і, шануючы звычай,*
*іх жнеі сярпом абмінуць».*

Няхай жа спяваюць для вашых сэрцаў беларускія птушкі і беларускія паэты — нават у самыя трывожныя часы чытайце родную літаратуру.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## Леанід ЗАХЛЕЎНЫ:

# «ТРЭБА, КАБ ПА ТВОРАХ КАМПАЗІТАРА МОЖНА БЫЛО ПАЗНАЦЬ, НА ЯКОЙ ЗЯМЛІ ЁН ЖЫВЕ»

**Песні ансамбля «Бяседа» ўжо даўно сталі неад'емнай часткай святочных сустрэч у коле блізкіх людзей. А кіраўнік ансамбля, кампазітар, народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны Леанід Захлеўны сёлета адзначыў 75-годдзе. Дзякуючы яго таленту на свет з'явіліся шматлікія камерныя, сімфанічныя, вакальныя і харавыя сачыненні. Асаблівае месца ў творчасці Леаніда Канстанцінавіча займае работа ў песенным жанры. Музыка кампазітара жыве таксама ў спектаклях, кінастужках і мультфільмах. Як сам аўтар, так і яго творы застаюцца непадуладныя часу. Мы сустрэліся з маэстра, каб згадаць адметныя перыяды мінулага, пацікавіцца поглядам на творчасць маладых і даведацца, што дае яму сілу не спыняцца...**



***— Леанід Канстанцінавіч, некалі жаданне вашага бацькі «каб сын навучыўся граць на баяне» прадвызначыла ваш прафесійны лёс. Як вы да таго ставіліся і ці не было імкнення выбраць зусім іншы напрамак у жыцці?***

— Мой бацька сапраўды любіў музыку, і на баяне ён іграў як самавучка. Выконваў адну песню — «Узяў бы я бандуру». Тата быў родам з Украіны і марыў, каб я навучыўся граць на баяне і стаў музыкантам. Хоць сам, вядома, не думаў, што адбудзецца такі паварот, і я пачну сур'ёзна займацца музыкай. Але ў музычную школу сын пайшоў і любімую татаву песню граць навучыўся. Акрамя гэтага, у дзяцінстве мне падабаліся песні ў выкананні такіх выдатных артыстак, як Лідзія Русланава, Клаўдзія Шульжэнка, якія ў той час былі вельмі папулярнымі. Мама мне нават расказвала, што калі я чуў іх спеў па радыё, то браў падушку і ўяўляў, нібы акампаніру́ю ім на гармоніку. Музыка мяне заўсёды прыцягвала. Асабліва спявачкі з народным выкананнем. Я падбягаў да радыёпрыёмніка і слухаў. Калі маю зацікаўленасць музыкай заўважыў бацька, то ён зрабіў правільную выснову, прыняўшы рашэнне, што гэтую здольнасць трэба развіваць. Памятаю, ён нават сказаў неяк: «Вось навучышся граць і тады ў арміі будзеш не маршыраваць, а станеш удзельнікам аркестра». І я пайшоў у музычную школу.

***— Так музыка ўжо не адпусціла...***

— На ўсім творчым шляху са мной побач заўсёды былі вельмі таленавітыя людзі. Мой першы настаўнік музыкі Яўген Канстанцінавіч Петрашэвіч з Гродна крыху нават сам пісаў музыку і ўжо тады падштурхоўваў спрабаваць рабіць нешта сваё. Ці, напрыклад, калі я вучыўся граць марш, то настаўнік маршыраваў па класе, каб я бачыў, у якім характары і тэмпе трэба выконваць гэты твор. У музычным вучылішчы таксама было шмат настаўнікаў, якія дапамагалі мне расці. А потым да нас як старшыня экзаменацыйнай камісіі прыязджае вядомы беларускі кампазітар Эдзі Майсееўна Тырманд. Паслухаўшы мае творы і творы сябра Віктара Войціка, якія мы выконвалі на дзяржэкзаменах, яна прапанавала нам далей працягваць музычную адукацыю па класе кампазіцыі ў Белдзяржкансерваторыі. Тады кафедрай кампазіцыі загадваў Анатоль Васільевіч Багатыроў, выдатны выкладчык, заснавальнік беларускай кампазітарскай школы. Сабралі кафедру і праслухалі нас, а па выніках прынялі на падрыхтоўчае аддзяленне па класе кампазіцыі. Паўстаў выбар: працягваць вучыцца граць на баяне ці асвойваць новую прафесію. Вырашыў зняць з сябе адказнасць і параіцца з бацькамі. Мая мама сказала: «Бог дапаможа!». Так пачалася вучоба на падрыхтоўчых курсах. А калі ўдалося за год прайсці двухгадовую праграму, то мяне і Віктара Войціка ўзялі на асноўны курс. Вельмі пашчасціла вучыцца ў Анатоля Васільевіча Багатырова, які выхаваў цэлую плеяду вядомых беларускіх кампазітараў (Яўген Глебаў, Ігар Лучанок, Дзмітрый Смольскі і інш.), якія сталі набыткам беларускай музычнай культуры. Ён адчуваў патэнцыял маладых адораных людзей. Але ж дараванне трэба накіроўваць і развіваць. І наш настаўнік заўсёды знаходзіў для нас такія словы, якія натхнялі. Ніколькі не шкадую, што так склаўся мой лёс. Бо калі побач з табой людзі, якія даюць надзею і аптымізм, і ставяцца як да роднага, гэта дарагога варта.

***— А калі вы адчулі цікавасць і любоў да фальклору?***

— Першымі нашымі творамі сталі апрацоўкі беларускіх народных песень. Гэта было ў класе Багатырова на працягу ўсяго першага курса. Лічу, што для кожнага будучага кампазітара народная песня, фальклор павінны стаць асновай яго творчасці, каб па яго творах можна было пазнаць, на якой зямлі ён жыве. Таксама я памятаю фальклорныя экспедыцыі, якія ўнеслі вялікі ўклад у нашу прафесійную адукацыю. І цяпер, і на працягу ўсёй сваёй творчай дзейнасці я максімальна імкнуўся выкарыстоўваць у сваіх творах беларускі мелас, характэрныя матывы беларускай народнай песні.

***— Потым вы арганізуеце ансамбль «Бяседа»...***

— Так здарылася. Я ў той перыяд працаваў мастацкім кіраўніком усіх музычных калектываў Белтэлерадыёкампаніі. І быў цудоўны ансамбль «Жывіца» пад кіраўніцтвам Валянціны Пархоменкі. У 1990 годзе па запрашэнні беларускай дыяспары калектыў з канцэртамі паехаў у Амерыку, а вярнуліся артысты ўжо без сваёй кіраўніцы. Мне вельмі хацелася захаваць калектыў, таму я вырашыў заняцца ім у чаканні, пакуль з Амерыкі вернецца Пархоменка. А як стала зразумела, што чакаць марна, то я ўзяў ансамбль пад сваё кіраўніцтва. Самі артысты прасілі не пакідаць іх. Мне тая работа была блізкай, паколькі я сам баяніст, як кажуць, народнік і беларуская народная песня — аснова маёй творчасці.

...Самае галоўнае, што мне за раз 75 гадоў споўнілася, а я адчуваю, што нічога не змянілася. Трэба рухацца і працаваць, таму што талент — гэта толькі адна дзясятая доля поспеху, аванс, што дадзены табе ад Бога. Талент патрабуе развіцця, працавітасці і натхнення. Хаця самае цікавае, што якраз натхнення я ніколі не чакаў, бо перакананы, што яно прыходзіць падчас працы. Гэта такая азартная рэч, якая зацягвае цябе. І ты ўжо проста не можаш жыць па-іншаму. Мне вельмі падабаюцца словы нашага вядомага беларускага кампазітара Дзмітрыя Смольскага: «Кампазітар — гэта не той, хто піша музыку, а той, хто не можа яе не пісаць». Калі чалавек дасягае такога разумення, то і музыка пачынае складацца асэнсавана, а аўдыторыя, пачуўшы мелодыю, замірае ад прыгажосці, што выйшла з тваёй душы.

***— Што было на душы ў 14-гадовага юнака, калі вы ехалі ад бацькоў у Гродна паступаць?***

— У 1961 годзе майго бацьку па службе перавялі ў Казахстан. Наша сям'я пераехала ў Акмолінск (цяперашні Нур-Султан), дзе я і заканчваў музычную школу. Калі мы прыехалі ў гэты горад, там стаяла, можа, дамоў дзесяць, а астатнія былі нібы мазанкі, самаробныя прыбудовы. Мяне пасля Гродна, з яго гісторыяй, архітэктурай і цывілізацыяй, новыя мясціны не ўразілі, і таму адразу пачаў збіраць грошы на зваротны білет. І тое, што ў Акмолінску не было музычнага вучылішча, якраз стала добрай нагодай зноў вярнуцца ў Гродна і працягваць музычную адукацыю. Таму ўзяў баян і праз пэўны час вярнуўся назад у Беларусь. А мама вельмі перажывала за мяне, паколькі мне аднаму, чатырнаццацігадоваму хлопчыку, трэба было з перасадкай у Маскве даехаць да Гродна. У дарозе за некалькі сутак усякае магло здарыцца. Дзякаваць Богу, даехаў і паспяхова здаў іспыты. І з гэтага моманту пачалася прафесійная праца. Мой старэйшы ўнук неяк спытаў: «Дзядуля, скажы, а гэта крута — быць кампазітарам?» Гэта такое дзіцячае ўспрыманне прафесіі... На што я адказаў: «Так, але патрэбна шмат працаваць». І калі ты адказны за калектыў, то трэба дапамагаць кожнаму развівацца і расці. Я хачу падкрэсліць, што самае галоўнае для творцы — любоў да роднай зямлі і людзей, якія на ёй жывуць. Не варта нікому зайздросціць, трэба ўмець радавацца чужым поспехам, бо ў свеце хопіць месца ўсім таленавітым людзям.

***— Вы неяк адзначылі, што работу з ансамблем «Бяседа» лічыце самым плённым перыядам сваёй творчасці. Сёння на чым засяроджваецеся ў дзейнасці з калектывам?***

— Так, хочацца адзначыць, што ансамбль «Бяседа» існуе ўжо болей за трыццаць гадоў. Для мяне гэта вялікі творчы шлях і вельмі цікавая праца, дзе я сябе цалкам рэалізаваў як кампазітар. Наш калектыў — гэта дружная сям'я таленавітых спевакоў і музыкантаў, аднадумцаў, улюбёных у сваю прафесію і ў беларускую народную песню. Акрамя таго, што мы звяртаемся да беларускіх песень, пішам і аўтарскія кампазіцыі. Я сам, напрыклад, шмат напісаў мелодый на народныя словы. Бывае, што народны тэкст для песні цікавы, але сюжэт не вельмі раскрыты, і, як кампазітар, я дазваляю сабе нейкія моманты па тэксце дарабляць, але тое трэба рабіць акуратна і з добрым густам. У праграмы «Бяседы» ўключаем і творы іншых беларускіх кампазітараў. Выконваем і ўзоры класічнай музыкі, каб найбольш шырока на канцэртах прадставіць музычную палітру. Так будуць і эмоцыі, і густ выхоўвацца ў слухачоў.

***— Чым вымяраецца для вас поспех сёння?***

— Я ніколі спецыяльна не імкнуся пісаць такія творы, якія адразу ўразяць публіку. Таму што калі аўтар задаецца такой мэтай, то ён поспеху не даб'ецца, бо ў зробленым не будзе душэўнасці і сардэчнасці. З'явіцца проста яшчэ адно мёртвае, кан'юнктурнае сачыненне. А поспех — гэта калі ты працуеш і адчуваеш, як узлятае твая душа, часам нават у самога мурашы з'яўляюцца... Поспех — рэч непадкантрольная, але ён заўсёды цябе напатакае, калі ты шчыры са сваімі слухачамі, паважаеш іх і падбіраеш ключык да сваёй аўдыторыі...

**Алена ДРАПКО.**
**Поўны тэкст інтэрв'ю чытайце на сайце zviazda.by**

# МАСТАЦТВА КІРАВАЦЬ МУЗЫКАЙ

## Форум дырыжораў упершыню пройдзе ў Магілёве

**У Магілёве ладзіцца культурна-асветніцкі праект «Форум дырыжораў» — мерапрыемства пройдзе першы раз. Удзел у ім прымаюць беларускія і расійскія дырыжоры. Адна з мэт форуму — абмен ведамі. Менавіта таму арганізатарамі запланавана правядзенне круглага стала, спікерам якога стане Эльвіра Тахірава — старшы выкладчык кафедры аркестравага дырыжыравання і інструментоўкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Семінар-практыкум правядзе галоўны дырыжор рускага народнага аркестра Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных «Душа Расіі» Уладзімір Шкуроўскі, а майстар-клас па дырыжыраванні дасць Віктар Акуловіч — прафесар Санкт-Пецярбургскай дзяржаўнай кансерваторыі імя М. А. Рымскага-Корсакава. Паслухаць акадэмічную музыку і сусветныя хіты можна будзе 17 і 18 сакавіка ў Магілёўскай абласной філармоніі.**

**Намеснік дырэктара Магілёўскай філармоніі Алёна ПРУДНІКАВА** расказала «Звяздзе», што ў Беларусі такога маштабнага форуму, які сабраў бы дырыжораў з Беларусі і Расіі, дагэтуль не ладзілася. У межах праекта ўпершыню быў арганізаваны рэспубліканскі конкурс аркестраў народных інструментаў імя народнага артыста Беларусі Л. Л. Іванова, заяўкі да ўдзелу дасылаліся анлайн. Зараз сябры журы, у склад якога ўвайшлі мастацкія кіраўнікі ўстаноў культуры, абіраюць пераможцу.

**Галоўны дырыжор заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь аркестра народных інструментаў імя Іванова Дзяніс ЧАРТА** адзначыў, што на форуме будуць прадстаўлены ўсе рэгіёны Беларусі:

— Калі мы рыхтавалі мерапрыемства, то адной з нашых мэт было прадставіць выканаўцаў розных узростаў. У нашым праекце задзейнічаны навучэнцы дзіцячых музычных школ, студэнты каледжаў і Акадэміі музыкі, а таксама прафесійныя калектывы. У дні правядзення форуму адбудзецца два разнапланавыя мерапрыемствы. Першае — канцэрт эстрадная музыка, дзе прагучаць сусветныя хіты ў выкананні дзяцей Магілёўшчыны і нашага аркестра. Другое — гала-канцэрт, на якім можна будзе паслухаць акадэмічную музыку ў выкананні ўдзельнікаў і сяброў журы анлайн-конкурсу.

Квіткі на канцэрты можна набыць у касе Магілёўскай абласной філармоніі.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# Извещение о проведении 13 апреля 2022 года аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

| Сведения о продаваемом имуществе | | | | |
|---|---|---|---|---|
| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Сведения о земельном участке | Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС | Размер задатка, бел. руб. |
| 1 | Капитальное строение с инв. номером 500/С-41939 общей площадью 668,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 12А/1, наименование – литер Б1/к. Здание специализированное складов, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ;<br>капитальное строение с инв. номером 500/С-41940 общей площадью 635,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 12А, наименование – литер А1/к. Здание специализированное складов, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ;<br>капитальное строение с инв. номером 500/С-41941 общей площадью 289,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 12А/2, наименование – здание специализированное складов, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ;<br>капитальное строение с инв. номером 500/С-41942 общей площадью 201,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 12А/3, наименование – литер Г1/бл. Здание специализированное складов, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,8374 га, кадастровый номер – 500000000004002829 | 1 273 200,00 | 127 000,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. номером 500/С-44605 общей площадью 843,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Суражская, 15, наименование – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер А1/к, д), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: литер а – площадка, литер б – ограждение, литер в – железнодорожные пути | Право аренды на земельный участок площадью 0,3087 га, кадастровый номер – 500000000005003710, по 31.03.2022 | 622 800,00 | 62 200,00 |
| 3 | Капитальное строение с инвентарным номером 633/С-10565 общей площадью 66,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Будславский с/с, п. Будслав, наименование – магазин № 50, назначение – здание специализированное розничной торговли | Площадь – 0,0395 га, кадастровый номер – 624080602101000023 | 4 920,00 | 492,00 |
| 4 | Капитальное строение с инв. номером 633/С-10564 общей площадью 64,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Княгининский с/с, аг. Княгинин, ул. Привокзальная, д.81, наименование – магазин № 42, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – кирпичное здание магазина, два кирпичных склада | Площадь – 0,0379 га, кадастровый номер – 624082004601000184 | 5 640,00 | 564,00 |
| 5 | Капитальное строение с инвентарным номером 410/С-21443 общей площадью 253,0 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Октябрьская, 93, наименование – административное здание, назначение – здание административно-хозяйственное, составные части и принадлежности: административное здание с мансардой л-А1/к, три пристройки л- б1/к, В1/к, Г1/к, две холодные пристройки л-1,2, пять сараев л-3,4,5,6,7, уборная л-8, забор л-а, мощение л-б, ворота л-в, калитка л-г | Площадь – 0,1612 га, кадастровый номер – 420850100001006904 | 103 200,00 | 10 300,00 |
| 6 | Капитальное строение с инв. номером 410/С-27187 общей площадью 444,4 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Новые Борки, 1/1, склад, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: склад л-А 1/к, склад л-Б 1/к, склад л-В 1/к, склад л-Г 1/к, гараж л-Д 1/к;<br>капитальное строение с инв. номером 410/С-26719 общей площадью 75,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Новые Борки, 1/2, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ 2 29 08, составные части и принадлежности: уборная л-1;<br>капитальное строение с инв. номером 410/С-26718 общей площадью 25,9 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Новые Борки, 1, наименование – контора склада, назначение – здание административно-хозяйственное 2 29 10, составные части и принадлежности: навес л-Б, ограждение л-В, ограждение л-в1, ограждение л-в2, ограждение л-в3, ворота л-в4, ворота л-в5 | Площадь – 0,2816 га, кадастровый номер – 420850100001006901 | 68 320,00 | 6 800,00 |
| 7 | Капитальное строение с инв. номером 630/С-65814 общей площадью 94,9 кв. м, (наименование – бухгалтерия-склад, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности – кирпичная холодная пристройка, два склада-холодильника, пять дощатых сараев); капитальное строение с инв. номером 630/С-65813 общей площадью 122,8 кв. м, (наименование – кондитерский цех, назначение – здание неустановленного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-65811 общей площадью 157,6 кв. м, (наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-65816 общей площадью 42,0 кв. м, (наименование – административное здание, назначение – здание административно-хозяйственное), расположенные по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Вокзальная, 4, и капитальное строение с инв. номером 630/С-79669 протяженностью подземной прокладки 4,10 м (наименование – водопроводные сети, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения), расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Вокзальная | Площадь – 0,1382 га, кадастровый номер 623850100003001899 | 32 659,47 | 3 200,00 |
| 8 | Капитальное строение с инвентарным номером 413/С-528 общей площадью 48,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Свислочский р-н, Порозовский с/с, гп Порозово, ул. Ленина, 12, наименование – автостанция, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, составные части и принадлежности: пристройка л-1, уборная л-2;<br>капитальное строение с инвентарным номером 413/С-529 общей площадью 13,4 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Свислочский р-н, Порозовский с/с, гп Порозово, ул. Ленина, 12/1, наименование – сарай, назначение – здание нежилое | Площадь – 0,0446 га, кадастровый номер – 425255700001000037 | 16 080,00 | 1 608,00 |
| 9 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-113573, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А, общей площадью 1 181,8 кв. м, наименование – здание промбазы, назначение – здание специализированное иного назначения | Площадь – 0,1607 га, кадастровый номер – 141000000001005239 | 133 200,00 | 13 300,00 |
| 10 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117135, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А/2, общей площадью 684,9 кв. м, наименование – здание арочного склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2340 га, кадастровый номер – 141000000001005245 | 49 800,00 | 4 900,00 |
| 11 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117136, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А/3, общей площадью 209,0 кв. м, наименование – мебельный склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,0427 га, кадастровый номер – 141000000001005219 | 25 260,00 | 2 500,00 |
| 12 | Капитальное строение* с инв. номером 110/С-113574, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А/4, общей площадью 466,2 кв. м, наименование – здание холодильника, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,0997 га, кадастровый номер – 141000000001005218 | 61 200,00 | 6 100,00 |
| 13 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117144, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А/6, общей площадью 1 212,7 кв. м, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2238 га, кадастровый номер – 141000000001005216 | 146 400,00 | 14 600,00 |
| 14 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117137, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/9, общей площадью 855,6 кв. м, наименование – овощной склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,1865 га, кадастровый номер – 141000000001005217 | 102 000,00 | 10 200,00 |
| 15 | Капитальное строение** с инв. номером 110/С-114895, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/10, общей площадью 737,0 кв. м., наименование – здание овощехранилища, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,1753 га, кадастровый номер – 141000000001005244 | 88 200,00 | 8 800,00 |
| 16 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117138, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/11, общей площадью 775,1 кв. м, наименование – овощехранилище, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2055 га, кадастровый номер – 141000000001005211 | 81 600,00 | 8 100,00 |
| 17 | Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-117143, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/12, общей площадью 212,7 кв. м, наименование – здание столярного цеха, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель | Площадь – 0,0548 га, кадастровый номер – 141000000001005212 | 26 640,00 | 2 600,00 |
| 18 | Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-114896, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/13, общей площадью 218,6 кв. м, наименование – здание лукохранилища, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,0656 га, кадастровый номер – 141000000001005213 | 25 920,00 | 2 500,00 |
| 19 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117145, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/15, общей площадью 703,6 кв. м, наименование – здание склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2034 га, кадастровый номер – 141000000001005243 | 82 200,00 | 8 200,00 |
| 20 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117140, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/16, общей площадью 227,5 кв. м, наименование – здание коптильного цеха, назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака | Площадь – 0,1566 га, кадастровый номер – 141000000001005214 | 27 000,00 | 2 700,00 |
| 21 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117139, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/17, общей площадью 317,2 кв. м, наименование – склад шиферный, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,1457 га, кадастровый номер – 141000000001005215 | 23 820,00 | 2 300,00 |
| 22 | Изолированное помещение*** с инв. номером по бухгалтерскому учету 088554 общей площадью 169,2 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Станционная, 1-17, наименование – торговое помещение, назначение – торговое помещение | – | 18 504,00 | 1 800,00 |
| 23 | Капитальное строение с инв. номером 240/С-45976 общей площадью 115,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2, наименование – здание магазина № 61, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – электрические сети; капитальное строение*** с инв. номером по бухгалтерскому учету 084792 общей площадью 22,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2/1, наименование – здание склада | Площадь – 0,0370 га, кадастровый номер – 223684400001000005 | 1 826,89 | 180,00 |
| 24 | Капитальное строение с инв. номером 240/С-44733, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Щетинковская, 39А, общей площадью 1422,1 кв. м; наименование – здание склада с теневым навесом; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; составные части и принадлежности – теневой навес, площадка | Площадь – 0,4652 га, кадастровый номер – 223650100001016130 | 54 769,20 | 5 400,00 |
| 25 | Капитальное строение с инв. номером 240/С-44721, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Щетинковская, 39Б, общей площадью 494,6 кв. м; наименование – здание склада (картофелехранилище); назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; составные части и принадлежности – пристройка, забор, площадка | Площадь – 0,2102 га, кадастровый номер – 223650100001016129 | 21 228,00 | 2 100,00 |
| **Недвижимое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, техническим характеристикам и комплектации, рекомендуется осмотр** | | | | |

** Ограничения (обременения): аренда до 11.07.2022 г. ** Ограничения (обременения): аренда до 31.03.2022 г.*

**** Согласно подпункту 9.1 пункта 9 Указа Президента Республики Беларусь от 31.12.2018 № 506 «О развитии Оршанского района Витебской области», отчуждение расположенных на территории Оршанского района объектов недвижимого имущества, находящихся в государственной собственности и собственности юридических лиц, более 50 процентов акций (долей в уставных фондах) которых находится в государственной собственности, либо входящих в состав холдингов с участием государства, может осуществляться без наличия технических паспортов, а также документов, удостоверяющих государственную регистрацию прав на данное имущество. имеются ограничения (обременения): аренда до 30.09.2022 г.*

**Продавец имущества:** ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов**: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона:

по предметам торгов **№ 1–6, 8–25** в размере 2 (двух) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов;

по предмету торгов **№ 7** в размере 3 (трех) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 13.04.2022.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **13 апреля 2022 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 14.03.2022 по 11.04.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 240-62-06.

**Телефоны для справок:**
(017) 360-42-22, 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»).

Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

# ВЫЙСЦІ З ЦЕМРЫ

## Як людзі вяртаюцца да звычайнага жыцця пасля цяжкага лячэння

**З кіраўніком Мінскага клубнага дома «Адкрытая душа» (служба рэабілітацыі для людзей з псіхічнымі захворваннямі) я пазнаёмілася падчас дыскусіі пра псіхічнае здароўе. І толькі потым зусім выпадкова даведалася, што Павел Лотвін сам мае дыягназ — біпалярнае афектыўнае расстройства (далей — БАР). Былы настаўнік гісторыі пасля таго, як прайшоў лячэнне ў псіхіятрычнай клініцы, звярнуўся па дапамогу ў клубны дом. І знайшоў тут сабе сяброў, працу і сэнс жыцця.**

### «МЯНЕ ВЫРАТАВАЎ ЗВАНОК СТАРАСТЫ»

Павел родам з горада Іўе Гродзенскай вобласці. Пасля школы паступіў на гістарычны факультэт БДУ і пераехаў жыць у сталіцу. На пятым курсе ў яго здарылася дэпрэсія, якая перарасла ў спробу самагубства.

— Аднойчы прачнуўся з думкай, што я няўдачнік, нічога не дабіўся ў жыцці. Хоць для гэтага не было ніякіх перадумоў. Тым не менш думкі былі вельмі навязлівыя. Я не мог прымусіць сябе ўстаць з ложка. У грудзях адчуваў цяжар, як быццам штосьці на мяне ціснула, нават дыхаць было цяжка. Падумаў: калі я ляжу і пакутую, напэўна, не варта і жыць. Мяне выратаваў званок старасты. Яна спытала, чаму я не на занятках. Я сказаў, што больш ніколі туды не прыйду. Мы з ёй паразмаўлялі, і мне стала крыху лягчэй.

Павел разумеў, што з ім адбываецца штосьці не тое. Але ўсе — бацькі, знаёмыя — казалі: супакойся, гэта проста пяты курс, дзяржэкзамены, стрэс. Больш гуляй на свежым паветры, адпачні.



Андрэй КАЧАНОЎСКІ знайшоў у клубным доме справу па душы.

Пасля заканчэння ўніверсітэта малады спецыяліст паехаў працаваць па размеркаванні ў вясковую школу настаўнікам гісторыі.

— Я мучыўся больш як год, цягнуў да апошняга, бо баяўся сам сабе прызнацца, што ў такім маладым узросце стаў псіхам. Толькі калі ў мяне зніклі эмоцыі, апетыт і смак ежы — яна была як крэйда — я прыйшоў да псіхіятра і сказаў: дапамажыце. Доктар, пажылая жанчына, паглядзела на мяне і адразу сказала: у вас наймацнейшая дэпрэсія, патрэбна тэрміновая шпіталізацыя. У выніку я праляжаў у медустанове ў Навінках месяц. Мне трапіліся добрыя ўрачы, якія падабралі ўдалую дазіроўку, хоць пры маім дыягназе гэта няпроста (БАР характарызуецца моцнымі перападамі настрою). Калі я выйшаў з бальніцы, мне стала лягчэй.

Са школы Паўлу давялося звольніцца, бо працаваць з дзецьмі яму ўжо было нельга. Ад таблетак, якія прапісалі, з'явіліся пабочныя эфекты: хлопец стаў набіраць вагу, адчуваў павышаную санлівасць. Таму ў нейкі момант перастаў іх прымаць: падумаў, што ўжо вылечыўся і ўсё будзе нармальна.

— Першы час я быў на пазітыве, спаў па 3-4 гадзіны і не адчуваў ніякай стомы. У выніку гэта ўсё перарасло ў сур'ёзныя маніі. У той час я жыў у Мінску, здымаў кватэру каля заапарка. Я з дзяцінства цікавіўся жывёламі, зоаабаронай, глядзеў дакументальныя фільмы на гэтую тэматыку. Неяк схадзіў у заапарк і ўбачыў ільва у клетцы. Было спякотна, жывёла цяжка дыхала. І мне чамусьці падалося, што я павінен яе выпусціць. Быў перакананы, што так будзе справядліва... Пазней захацелася з некім падзяліцца сваёй ідэяй. Пазваніў знаёмай і сказаў, што іду — а было ўжо тры гадзіны ночы — ратаваць ільва. Яна мяне забрала на таксі літаральна каля ўвахода ў заапарк... Праз нейкі час даведаўся, што адмянілі візы ў Кітай. Яшчэ з гістфака я захапляўся гісторыяй гэтай краіны і вырашыў, што мне трэба абавязкова туды паехаць. Заказаў па інтэрнэце білет, узяў пару соцень долараў сваіх зберажэнняў і ў чым быў адправіўся ў аэрапорт. Мне здавалася, што менавіта ў Кітаі я знайду сэнс жыцця. На шчасце, за некалькі гадзін да вылету пазваніла цёця і нешта спытала. Я адмахнуўся, маўляў, «не ведаю, я наогул у Кітай лячу». Яна тут жа прыехала і забрала мяне. Толькі тады я зразумеў, што гэта не жартачкі, захворванне сур'ёзнае і трэба лячыцца. Я зноў пайшоў да псіхатэрапеўта і стаў рэгулярна прымаць прапісаныя таблеткі. У выніку сёмы год знаходжуся ў рэмісіі, сімптомы хваробы ў мяне не праяўляюцца. Сёння магу дакладна сказаць, што псіхічны дыягназ — гэта не прысуд, таму ні ў якім разе не варта апускаць рукі. Каліназіраць за сваім станам і працаваць над сабой, можна выйсці ў рэмісію і жыць нармальна. У прыватнасці, я адмовіўся ад кафеіну, ад позніх пасядзелак, пачаў выконваць рэжым дня.

Праўда, ні сябры, ні нават сваякі хлопца зусім не разумелі.

— Тата казаў: «Напэўна, ты нешта сабе прыдумваеш». Гэта вельмі цяжка, калі ты застаешся сам-насам з такой праблемай. Няма з кім паразмаўляць, падзяліцца. Таму я пачаў шукаць людзей з такімі праблемамі. У Расіі ёсць асацыяцыя «Біпалярнікі», заснаваная самімі пацыентамі. Я падумаў: чаму б у Мінску не арганізаваць падобную групу падтрымкі? Стварыў суполку «УКантакце», назваў яе «БАРсікі з Беларусі». Мне сталі пісаць людзі з розных гарадоў. Мы спачатку кантактавалі анлайн, а потым вырашылі сустрэцца ўжывую. Першая сустрэча адбылася ў парку Чалюскінцаў. Потым прыйшла зіма, стала холадна, і мы пачалі шукаць нейкае памяшканне. Так я даведаўся пра клубны дом. Спытаў, ці можам мы тут збірацца. Мне пайшлі насустрач. З таго часу гэтае месца стала маім другім домам, сапраўдный адушынай.



Павел ЛОТВІН марыць, каб як мага радзей людзі з дыягназамі вярталіся ў псіхіятрычную клініку. І каб клубныя дамы з'явіліся і ў іншых беларускіх гарадах, бо там таксама хварэюць людзі (цяпер, акрамя Мінска, службы рэабілітацыі ёсць у Брэсце і Лідзе).

Павел быў спачатку сябрам клубнага дома, потым валанцёрам. Два гады таму былая кіраўніца службы рэабілітацыі Вольга Рыбчынская сышла, і хлопцу прапанавалі паспрабаваць свае сілы на яе месцы.

### «З ПЕРШАЙ ЖА ЗАРПЛАТЫ ЗАПРАСІЎ МАМУ Ў ТЭАТР»

Пасля выхаду з медустановы чалавек, як правіла, сутыкаецца з новай рэальнасцю. Вельмі часта ад яго адварочваюцца сябры, знаёмыя. Чужыя людзі абыходзяць бокам, а родныя не ведаюць, чым дапамагчы. У выніку чалавек замыкаецца ў сабе. Многія па 3-4 месяцы проста сядзяць у чатырох сценах, нават на вуліцу не выходзяць. Нядзіўна, што пасля такой самаізаляцыі кантактаваць з людзьмі становіцца вельмі цяжка.

— Некаторыя прыходзяць і проста першы час сядзяць моўчкі, — кажа Павел Лотвін. — Клубны дом — сапраўднае выратаванне для такіх людзей, бо сацыяльная ізаляцыя ўзмацняе трывожныя і дэпрэсіўныя думкі, і чалавек часцей за ўсё зноў трапляе ў бальніцу. Мы ж дапамагаем вярнуцца да паўнавартаснага жыцця, аднавіць як камунікатыўныя, так сацыяльна-бытавыя навыкі.

У клубным доме ёсць духоўка, мультыварка і мікрахвалеўка. Падапечныя збіраюцца і разам вырашаюць, што будуць гатаваць, прычым кожны павінен здаць па рублю на прадукты. Гэта вельмі важны момант рэабілітацыі: людзі павінны адчуваць адказнасць. Потым размяркоўваюць ролі: хтосьці ідзе ў краму па неабходныя інгрэдыенты, нехта наразае агародніну, абірае бульбу.

Вялікай праблемай, паводле слоў Паўла, з'яўляецца празмерная апека з боку бацькоў. Даходзіць да таго, што некаторыя маладыя людзі, якія ўпершыню прыходзяць у клубны дом, нават не ў стане памыць за сабой кубак, не кажучы ўжо пра падлогу. Калі просіш іх аб гэтым, чуеш у адказ: «А я не ўмею. За мяне мама мые».

— Не варта апякаць чалавека з дыягназам, як дзіця. Ён фізічна здаровы, у яго ёсць рукі, ногі, ён у стане сам сябе абслугоўваць. Гэта вельмі важна. Таму актыўна запрашаем на сустрэчы, якія праводзяць псіхолагі, бацькоў сваіх падапечных. Не так даўно да нас звярнулася жанчына. Яе сын сем разоў спрабаваў скончыць жыццё самагубствам. У выніку жыццё маці ператварылася ў суцэльны кантроль. Яна прыходзіла на працу і не магла дачакацца моманту, каб выйсці і патэлефанаваць, спытаць, як ён там. З-за гэтай гіперапекі ў іх часта былі канфлікты. Нашы спецыялісты параілі жанчыне адпусціць сітуацыю, даць сыну больш свабоды. Малады чалавек прайшоў лячэнне, і тое, што ён жыць дома і не хоча нічым займацца, — гэта пабочны эфект, трэба проста даць час, каб ён аднавіўся. Хоць не адразу, але яна пагадзілася. У выніку праз паўтара месяца хлопец уладкаваўся на працу мыйшчыкам машын. І з першай жа зарплаты запрасіў маму ў тэатр. Жанчына прыйшла ў клубны дом шчаслівая. Дзякавала, што дапамаглі наладзіць кантакт з сынам. Мне гэты выпадак запаў у душу. Вельмі часта сваякі не разумеюць сітуацыі: маўляў, раз цябе выпісалі з бальніцы — значыць, вылечылі, ідзі працуй. З-за гэтага ўзнікаюць канфлікты. У выніку прайграюць усе: бацькі эмацыянальна выгараюць, а стрэс, у якім жыве чалавек з дыягназам, прыводзіць да абвастрэнняў і чарговых шпіталізацый.

### «ХАЧУ ЗАРАБЛЯЦЬ ГРОШЫ САВЁЙ ТВОРЧАСЦЮ»

Сёння ў Мінскім клубным доме 186 падапечных. Адзін з самых актыўных — Андрэй Качаноўскі. Мужчыну 44 гады, наведвае службу рэабілітацыі ўжо 10 гадоў, трапіў сюды, як і большасць падапечных, па парадзе свайго доктара.

Дзяцінства Андрэя прайшло ў пасёлку Навінкі, побач з вядомым Цэнтрам псіхічнага здароўя. Калі ён вырас, лёс сыграў з ім злы жарт — мужчына трапіў туды з дыягназам шызафрэнія.

— Моцна напужаў усіх. Паводзіў сябе не вельмі добра, — пра гэтыя няпростыя часы Андрэй не любіць згадваць. — Калі ісці па жыцці без веры ў душы, то вельмі лёгка аступіцца, трапіць у яму. Цяпер я не блукаю, чытаю Біблію, малюся раніцай і ўвечары, п'ю таблеткі. Апошні раз быў у бальніцы ў 2011 годзе. Пасля таго як выпісаўся, большасць сяброў ад мяне адвярнулася. Мама памерла яшчэ ў 2005 годзе, яна адна мяне гадавала. Зараз жыву з бабуляй, ёй 93 гады. Па чарзе са сваякамі даглядаем яе.

Па прафесіі Андрэй — плітачнік. Пасля хваробы шлях на будоўлю для яго закрыты. Але мужчына з пазітывам глядзіць у будучыню. У клубным доме ён знайшоў справу па душы — захапіўся фатаграфіяй. Адкладваў са сваёй пенсіі грошы і купіў прафесійны фотаапарат. Цяпер практычна не расстаецца з ім, фатаграфуе людзей і прыроду. Стараецца рабіць у дзень як мінімум 20 кадраў, каб набіць руку, як ён кажа.

— Гэта, відаць, у мяне ад мамы. Колькі яе памятаю, фатаграфавала ўсіх у пасёлку, а потым праяўляла чорна-белую плёнку ў ваннай, — расказвае Андрэй і паказвае свае фотаздымкі, якімі завешаны сцены клубнага дома. — Спачатку ў клубны дом прыходзіла валанцёр і вучыла нас фатаграфаваць. Потым я наведваў платныя курсы па фатаграфіі пры Свята-Елісавецінскім манастыры. Цяпер вось мне падказалі арганізацыю, якая бясплатна вучыць працаваць з праграмай Photoshop. Хаджу туды па аўторках і пятніцах. Хачу падвучыцца і прадаваць свае фотаздымкі. Няхай будуць і невялікія грошы, але была б клубнаму дому падтрымка хоць нейкая. Я дапамагаў бы.

Пакуль жа Андрэй жыве на сваю пенсію па інваліднасці. І актыўна фатаграфуе на ўсіх імпрэзах клубнага дома.

— Андрэй — наш пазаштатны фатограф, — кажа Павел Лотвін. — Ён, як і большасць людзей з псіхічнымі захворваннямі, сутыкнуўся з праблемай працаўладкавання. Работадаўцы, даведаўшыся пра дыягназ, прымаць не хочуць. Тым не менш мы стараемся дапамагаць людзям пасля псіхіятрычных медустаноў знайсці не толькі захапленне, а па магчымасці і працу. Шчыльна супрацоўнічаем са Свята-Елісавецінскім манастыром, там ахвотна бяруць нашых падапечных у творчыя майстэрні. Да пандэміі некалькі чалавек працавала ў інклюзіўнай пякарні «Добрае печыва», у друкарні — грузчыкамі, на аўтазапраўцы — прыбіральшчыкамі памяшканняў. На жаль, пакуль гэта ў асноўным нізкакваліфікаваная праца.

***— Наведванне клубнага дома для людзей з дыягназам і іх сваякоў бясплатнае. Ведаю, што служба рэабілітацыі існуе сёння толькі дзякуючы дабрачынным ахвяраванням. Сярод беларусаў шмат неабыякавых людзей. Раскажыце, як можна вам дапамагчы?***

— Ёсць дабрачынныя кнопкі для абанентаў А1 і МТС. Пры іх дапамозе вельмі проста ахвяраваць ад 2 да 10 рублёў на карысць стваральніка клубнага дома — ГА «Беларуская асацыяцыя сацыяльных работнікаў». Акрамя таго, можна перавесці любую суму праз сістэму «Разлік» (АРІП). Падрабязная інфармацыя ёсць на сайце і ў сацсетках клубнага дома. Мы будзем рады не толькі фінансавай дапамозе, але і кожнаму валанцёру, які можа правесці майстар-клас для нашых падапечных, нечаму навучыць. У сезон добрыя людзі прыносяць лішкі агародніны са сваіх лецішчаў. Большасць падапечных жыве на сваю пенсію па інваліднасці, таму часта не могуць сабе дазволіць купіць абутак, куртку. Калі ў кагосьці ёсць рэчы, якія пыляцца ў шафе, іх таксама можна прынесці да нас, на Кнорына, 3.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
**Фота Таццяны БАЛЕНДЫ і аўтара.**

### ДАРЭЧЫ

Да 4 красавіка ў Мінску, у Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў (вул. Някрасава, 3), праходзіць незвычайная фотавыстава «З цемры». Тут можна ўбачыць 18 партрэтных здымкаў людзей з дыягназам шызафрэнія, БАР, дэпрэсія, трывожнае расстройства і іншыя. Сярод іх — і партрэт кіраўніка Мінскага клубнага дома Паўла Лотвіна. Фотапраект створаны, каб дапамагчы пераадолець негатыўнае стаўленне да людзей з псіхічнымі расстройствамі. Паказаць, што, нягледзячы на захворванне, кожны з іх застаецца асобай, кожны прыгожы і каштоўны.

# ПРАДАЦЬ СТАРЫЯ РЭЧЫ? ГЭТА РЭАЛЬНА!

**Як пазбавіцца ад непатрэбных рэчаў з выгадай для сябе — гэтае пытанне перыядычна ўзнікае ў многіх. На дапамогу прыходзяць рэдкія камісійныя крамы, сябры-знаёмыя, стары дзедаўскі спосаб — аб'ява ў газеце і сучасны — продаж праз інтэрнэт-пляцоўкі.**

## КАМІСІЙНЫЯ: КРАМЫ ДЗІЎНЫХ ЦЭН

У савецкі час камісійныя крамы былі не самым простым пунктам збыту паношаных рэчаў. Сюды здавалі адзенне, аксесуары тыя нямногія, хто выязджаў за мяжу і мог нешта прывезці. Тут жа сярод камітэнтаў былі тыя, хто меў сувязі ў крамах і мог купляць імпартныя тавары, пры гэтым хацеў часта мяняць уборы. Схема простая: выручыў грошы за ношанае — купіў новае. Калі адзенне перастала быць дэфіцытам, паціху сталі знікаць і камісійныя крамы.

У Мінску самая знакамітая камісіёнка знаходзіцца на Партызанскім праспекце. Пакуль ішла ад метро да крамы, сустрэлася з жанчынай, якая гучна размаўляла па тэлефоне: «Купіла сваіму старому дублёнку. У маладосці не пафарсіў, дык няхай зараз паходзіць!»

А ў краму можна было зайсці, абмінуўшы чаргу з некалькіх пажылых дам і адной маладой мамы, якія выстраіліся, каб здаць рэчы на камісію. Падобна, гэта сталы кантынгент, таму што таваразнаўца размаўляла з імі прыязна, нейк па-свойску.

Колькі тут усяго! Багатыя вітрыны з посудам. Відавочна, нямала неўжыванага, і цэны проста фантастычныя, у сэнсе смешныя. Ну, нідзе больш не ўбачыш кававых кубкаў па 30 капеек. Як заўзятая каваманка, ледзь не купіла: маўляў, на лецішчы якраз з такім малюнкам ёсць посуд. Самавітыя талеркі з пазалочаным абадком, працэнькія рондалі — усё ёсць. Яшчэ адна вітрына здзівіла рарытэтнымі электравілкамі і разеткамі, іншым дробным гаспадарчым інвентаром.

Іду да кранштэйнаў з адзеннем. Пасля ўцэнкі, якая па дамове праводзіцца праз 20 дзён, але на практыцы, па словах таваразнаўцы, можа адбыцца і праз месяц, мужчынская дублёнка каштуе 49 рублёў. Столькі ж — ношаны кажушок з пясца. Значыць, пачатковая цана гэтых рэчаў была 60 рублёў. А вось футра з нутрыі некалі моднага фасону, відаць, правісела ў шафе гадоў дваццаць: слядоў, што яго надзявалі, не заўважыла. І каштуе яно, зноў жа, пасля ўцэнкі, 180 рублёў. Яшчэ адно футра выглядае вельмі дыхтоўна і каштуе ў два раз танней. Шмат абутку і ўсялякіх кашуль, джэмпераў, пінжакоў, спадніц, а кошты — ад 10 рублёў...

Мэбля таксама ў продажы ёсць. Кухонныя шафікі ад 68 рублёў. На выгляд увогуле новыя. Відаць, што былі ва ўжыванні, але ў прыстойным стане канапы — па 240—350 рублёў.

Ці выгадна здаваць сюды рэчы? Давайце палічым. Па правілах, 45 % ад кошту продажу тавараў усіх груп (акрамя мэблі — 40 %) складае камісійны збор крамы. Такім чынам, калі дублёнку прададуць за 49 рублёў, то камітэнт (той, хто яе здаў) атрымае 27 рублёў. А за шэсць згаданых кававых кубкаў — 1 рубель.

Ці выгадна прадаваць мэблю? Мяркуйце самі. Разабраць, вынесці, пагрузіць, даставіць, выгрузіць, сабраць каштуе грошай. Тэлефаную па аб'явах пад выглядам патэнцыйнага кліента і высвятляю, што «калі ў вас не сценка з пяці секцый, то такая паслуга абыдзецца ад 80 да 100 рублёў». Канапу, мы памятаем, ацанілі ў 240 рублёў. З іх крама забярэ 40 % камісійных, значыць, на рукі застанецца 145 рублёў, мінус зборка-дастаўка, няхай 80 рублёў. Выніковы даход — 65 рублёў.

Варта адзначыць, што здадзеныя ў краму рэчы ўцэньваюцца некалькі разоў, да «цаны магчымай рэалізацыі». Калі і тады іх не купяць, то крама мае права ўтылізаваць тавар. А вось калі камітэнт захоча яго забраць з крамы, то давядзецца заплаціць 5 % ад першапачатковай цаны за поўны ці няпоўны месяц захоўвання. Так што можна не толькі не зарабіць, але яшчэ і патраціцца. Тым не менш крама не пустуе: адны здаюць тавар, а іншыя яго купляюць.

### Не прымаюць у камісіёнку:

- ✓лекі і касметыку;
- ✓пасцельную і ніжнюю бялізну, тавары для нованароджаных;
- ✓цацкі для дзяцей да трох гадоў;
- ✓ордэны і медалі з каштоўных металаў.

## ЛЕПШАЕ — СПАДКАЕМЦАМ, АСТАТНЯЕ — НА ПРОДАЖ

Мая суседка па лецішчы, калі мела 70 гадоў, вырашыла распарадзіцца сваімі ювелірнымі упрыгажэннямі. «Першай запрасіла дачку, яна выбрала завушніцы са смарагдамі і брыльянтамі, — расказала Раіса Іванаўна. — Наступнай да шкатулкі з упрыгажэннямі была дапушчана ўнучка. Вось уж здзівіла! Выбрала залатыя гадзіннічак, маўляў, буду не як усе і зручна. А яшчэ ёй спадабаліся бурштынавыя каралі. Нявестка заўсёды была неабыякавая да жэмчугу, і яе выбар быў адпаведны. Адразу пасля смерці мужа аддала сыну залатыя і сярэбраныя запінкі. Ён імі і зараз карыстаецца, а вось пакаленне ўнука такімі аксесуарамі не цікавіцца».

Сабе Раіса Іванаўна пакінула ланцужок з кулонам і завушніцы — падарунак мужа да 35-годдзя. Усё астатняе: некалькі масіўных пярсцёнкаў, такія ж завушніцы — жанчына аднесла ў «Антыквар». Звычайныя савецкія ўпрыгожванні распрадаліся прыкладна за паўгода... Учынак Раісы Іванаўны бурна абмяркоўваўся сярод знаёмых дачнікаў. Адны казалі, што «усё



myfin.by

трэба пакінуць дзецям» ну ці хоць бы аддаць грошы за ўпрыгожванні: маўляў, «гэта іх спадчына». А некаторыя ўзялі прыклад з жанчыны. Дзеці ж Раісы Іванаўны лічаць, што яна сама мае права распараджацца ўласнай маёмасцю без нейкіх парад.

У «Антыквары», дзе прымаюць на камісію ювелірныя ўпрыгожванні, свае правілы. Цяпер цана за грам золата складае 150 рублёў. Прынятыя на камісію рэчы з каштоўнага металу не пераацэньваюцца. Пасля продажу камісія крамы складае 35 %. А калі выраб не прададзены, то за месяц захоўвання ў краме трэба заплаціць 3 % ад кошту, калі ў ім ёсць брыльянты, і 1 % за больш простыя ўпрыгожванні.

**Здадзеныя ў краму рэчы ўцэньваюцца некалькі разоў, да «цаны магчымай рэалізацыі».**

У чым выгада? Дапусцім, здалі вы залаты ланцужок вагой тры грамы. Яго ацэняць у 450 рублёў. Мінус камісія 158 рублёў, на рукі выдадуць 292 рублі.

У гэтай жа краме прымаюць посуд мінулага стагоддзя і іншыя рарытэтныя штучкі. А вось хрусталь пакуль што выключылі са спіса. Камісія крамы за такія рэчы складае 40 %.

## НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ У ГАЗЕЦЕ

Яшчэ нядаўна ў продажы меліся спецыялізаваныя газеты бясплатных аб'яў. Цяпер і яны сышлі ў інтэрнэт. Літаральна некалькі выданняў публікуе платныя аб'явы, а самай вялікай папулярнасцю карыстаецца газета для пенсіянераў з купонам для бясплатных аб'яў.

«Наша пакаленне многія рэчы берагло, нешта купляла на запас, — кажа 67-гадовая Людміла Раманаўна. — Цяпер прыйшло разуменне, што дзецям усё гэта не трэба, і мы з сабой не забяром. Я вырашыла ўсе запасы распрадаць. Даю аб'явы ў газету, там іх вельмі шмат, таму выходзяць не хутка. Але прадаць рэчы можна, калі адэкватна ацэньваеш іх, тобок нядорага. Трэба проста разумець, што зараз хрустальная ваза — прадмет інтэр'еру, а не раскошы. Цешуся, калі атрымліваецца вызваліць прастору і нейкую капейку зарабіць».

Цяпер Людміла Раманаўна асвойвае інтэрнэт. Кажа, што чытала пра кірмашы, якія ладзяць з мэтай аддаць непатрэбныя рэчы і ўзяць патрэбныя. «Але, разумееце, гэта робіць моладзь, якая лічыць сябе вельмі разумнай, творчай і ўвогуле вышэйшай за ўсіх. Мяне ж на смех падымуць, калі я туды прыйду, — наракае жанчына. — А чаму б такія кірмашы не ладзіць для пажылых людзей? Я разумею: сярод нас могуць быць тыя, якія скажуць: маўляў, мой сервіз каштаваў 25 савецкіх рублёў, а твой абрус — 15, даплаці мне... Вядома, правілы кірмашу загадзя трэба абвяшчаць. Справа ў тым, што насельніцтва старэе, і каб пажылыя людзі не былі клопатам для грамадства, трэба прадумваць, чым і як іх займаць, чым дапамагаць, як ненадакучліва даваць сучасныя веды».

Вось так, разважаючы аб продажы непатрэбных рэчаў, мы дайшлі да абмеркавання глабальных праблем старэйшага пакалення.

## ШУКАЙЦЕ Ў ІНТЭРНЭЦЕ

Самая папулярная інтэрнэтпляцоўка для гандлю з рук — kufar.by. Праўда, і прапаноў там сотні тысяч. «Да нядаўняга часу я аддавала добрыя рэчы сваякам. Але цяпер, на жаль, набрала вагу, прыйшлося абнаўляць гардэроб. І фінансавае становішча сям'і стала горшае, таму свае дыхтоўныя рэчы выставіла на продаж і прыгледзелася, што прапануюць іншыя», — падзялілася Ганна, якая купіла маё понча. А ў мяне такіх аказалася два: адно купіла сама, другое падарылі, прычым абодва не толькі адной фірмы, фасону, але і колеру.

Ганна расказала, што ў яе літаральна за тры дні купілі дэмісезоннае паліто, куртку і два офісныя касцюмы: са спадніцай і штанамі. А вось святочныя сукенкі не запатрабаваны. Пры гэтым жанчына ўстанавіла лаяльныя кошты. «Мой прынцып — хоць бы нейкая кампенсацыя, гэта лепш, чым проста аддаць», — растлумачыла Ганна. Неўзабаве яна мае намер выставіць на продаж летнія рэчы.

А цяпер уявім, што маё понча за 50 рублёў Ганна купіла б у камісіёнцы. Мне дасталася б 27 рублёў. Калі ўлічыць, што купляла яго за 70 рублёў, то гэта зусім не выгадна, тым больш што гаворка ішла аб новай рэчы. Дарэчы, некаторыя пляцоўкі, напрыклад, ay.by, бяруць узнагароду ў залежнасці ад групы тавараў ад 1 % за прададзеную рэч.

**У савецкі час камісійныя крамы былі не самым простым пунктам збыту паношаных рэчаў. Сюды здавалі адзенне, аксесуары тыя нямногія, хто выязджаў за мяжу і мог нешта прывезці. Тут жа сярод камітэнтаў былі тыя, хто меў сувязі ў крамах і мог купляць імпартныя тавары, пры гэтым хацеў часта мяняць уборы.**

Яшчэ адзін важны момант у гэтым празрыстым гандлі: ці не давядзецца плаціць падаткі? Трэба разумець, што ўсе такія сайты, супольнасці ў сацсетках манітораць супрацоўнікі падатковых органаў. Іх цікавяць грамадзяне, якія выкарыстоўваюць такія пляцоўкі для незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці. Пад прыкметы такой дзейнасці могуць трапіць асобы, якія прадаюць шмат новых аднолькавых рэчаў. І тых, што былі ва ўжыванні, таксама. Вядома, некаторыя закупляюць у сэканд-хэндах брэндавыя рэчы, прыводзяць іх у парадак — ліквідуюць спецыфічныя пах, мыюць, прасуюць і прадаюць за больш высокі кошт, чым купілі. Вылічыць, хто гэтым сістэматычна займаецца, не вялікая праблема для спецыялістаў.

**МАЙЦЕ НА ЎВАЗЕ:**

1. Перш, чым адправіцца ў камісійную краму, стэлефануйцеся, удакладніце не толькі графік працы, але і ці прымуць вашы рэчы. Маюць значэнне сезон і наяўнасць месца ў гандлёвай зале для буйнагабарытных тавараў.

2. Прадаючы рэч праз інтэрнэт-пляцоўку, не завышайце кошт, інакш у падатковай службы будуць падставы лічыць, што вы рэалізоўваеце яе для атрымання прыбытку, а гэта ўжо прадпрымальніцкая дзейнасць.

3. Калі рэч купілі іншагароднія, то давядзецца перасылаць. Каб усё дайшло ў найлепшым выглядзе, добра спакуйце пасылку. Указанне кошту тавару, а таксама пры неабходнасці адзнака «далікатнае» робяць перасылку даражэйшай, але гэта неабходна, інакш у выпадку форс-мажору пошта не пакрые страты.



Маргарыта ДРАЗДОВА.

# ГУД БАЙ, АМЕРЫКА

## Чаму «здзьмуліся» Штаты?

**Экс-прэзідэнт ЗША Дональд Трамп палічыў рэйтынг адабрэння дзеючага кіраўніка дзяржавы Джо Байдэна завышаным і заявіў у эфіры Fox News, што Амерыка коціцца ў пекла праз палітыку цяперашняй адміністрацыі. Ён растлумачыў, што ў гарадах, дзе кіруюць аднапартыйцы дзеючага кіраўніка дзяржавы, злачыннасць зашкальвае. У Штаты масава прыбываюць крымінальнікі з іншых краін, прычым размова ідзе не толькі пра найбліжэйшых суседзяў, а пра больш як сотню краін. «Іх ніхто не правярае, з імі не праводзяць гутаркі, ды мы нават не ведаем, адкуль яны біруцца. Сярод іх, дарэчы, ёсць тэрарысты», — растлумачыў Трамп. Раней ён абвінавaціў цяперашняга амерыканскага лідара ў разбурэнні краіны. Сярод памылак дзеючай адміністрацыі экс-прэзідэнт назваў хаатычны вывад амерыканскай арміі з Афганістана, рост інфляцыі, беспарадкі на граніцы і сітуацыю з каранавірусам. Эксперты заўважаюць, што ЗША шмат у чым страцілі свае геапалітычныя пазіцыі на міжнароднай арэне. Чаму «здзьмуліся» Штаты?**

### ГЛАБАЛЬНЫ РАСКОЛ

Ваенная аперацыя Расіі ва Украіне нечакана выявіла на амерыканскім кантыненце гістарычных маштабаў раскол. Краіны лацінаамерыканскага рэгіёна сыходзяць з-пад уплыву Белага дома і набываюць палітычную самастойнасць, адзначыў vz.ru. Адметным падаецца расклад сіл у Генасамблеі ААН падчас разгляду рэзалюцыі па Украіне. «За» прагаласавала 141 дзяржава, 35 устрымаліся і ўсяго пяць, уключаючы саму Расію і Беларусь, выступілі супраць.

ЗША пагражалі санкцыямі тым краінам, якія не падтрымаюць рэзалюцыю Генеральнай Асамблеі ААН. Аб гэтым заявіла на брыфінгу афіцыйны прадстаўнік МЗС Расіі Марыя Захарава. «Заходнія краіны на чале з ЗША прыклалі, вядома, неймаверныя намаганні, каб забяспечыць шырокае адабрэнне гэтага дакумента, — адзначыла Марыя Захарава. — У ход пайшлі ўсе метады ўздзеяння — наогул усе. Працавалі як у Нью-Ёрку, так і па сталіцах. Быў і непрыкрыты шантаж, былі спробы подкупу, а былі пагрозы санкцыямі. Вось так было выбіта міжнароднае адзінства. І не трэба потым расказваць, што гэта адзіны голас Генасамблеі. Калі падняслі санкцыйнае дула да галавы іншай дзяржавы, якая не можа ў прынцыпе гэтаму процістаяць, — іншага выйсця няма».

Здаецца, ЗША ўдалося такім чынам назбіраць шмат саюзнікаў. Але гэта толькі на першы погляд. Сярод тых, хто прагаласаваў «за», ёсць дзяржавы, у якіх цудоўныя адносіны з Расіяй, у тым ліку і ў кантэксце бягучага крызісу. Напрыклад, найбуйнейшая лацінаамерыканская краіна — Бразілія. Яе прэзідэнт Жаір Балсанару ўпэўнена заяўляе, што ніякіх прэтэнзій да Масквы не мае, а супрацоўніцтва з ёй для яго вельмі каштоўнае. І гэта пры тым, што ў сваёй знешняй палітыцы ён яшчэ ўчора аддаваў перавагу ісці ў фарватары ЗША — проста зараз не ў сілах знайсці агульную мову з Джо Байдэнам.

Далей — больш. Сярод тых, хто ўстрымаўся, найбуйнейшыя дзяржавы свету — Кітай і Індыя. Яны аб'ядналіся на гэтай платформе. Галасаванне ў Генасамблеі выявіла тое, што Лацінская Амерыка выйшла з геапалітычнай апекі ЗША і жыве цяпер самастойным жыццём, дзе ў цэнтры знаходзяцца нацыянальныя інтарэсы. Схіліўшы да супрацьстаяння з Масквой амаль усю Еўропу, амерыканцы страцілі суседні кантынент. Нават Лопес Абрадор, прэзідэнт Мексікі, якая мяжуе з ЗША, у адрозненне ад Балсанару ідэалагічна блізкі да байдэнаўскіх дэмакратаў, выказаўся выразна, без усялякіх двухсэнсоўнасцяў: «Мы не будзем аб'яўляць санкцыі супраць Расіі і прымаць карныя меры эканамічнага тыпу, таму што хочам захаваць добрыя адносіны». Аналагічнае рашэнне ў розны танальнасці прыняла большасць дзяржаў Лацінскай Амерыкі.

### АГНЁМ І МЯЧОМ

Ёсць меркаванне, што прычыны такой сітуацыі варта шукаць у тоўшчах амерыканскага мінулага, пачынаючы з «дактрыны Манро», названай па імені пятага прэзідэнта ЗША, заўважыў vz.ru. Яе сутнасць простая: «Амерыка для амерыканцаў». Еўрапейскія дзяржавы не лезуць у справы падвойнага кантынента і не спрабуюць вярнуць сабе згубленыя калоніі, а ЗША, у сваю чаргу, не ўмешваюцца ў справы Старога Свету.

Гэтая дактрына адвадзіла ад Амерыкі еўрапейскіх драпежнікаў, але ператварыла лацінаамерыканскі свет у задні двор Злучаных Штатаў. Найбліжэйшага суседа — Мексіку — яны парэзалі на кавалкі, значна павялічыўшы сваю тэрыторыю, а астатнія дзяржавы рэгіёна прывучалі да паслухмянасці агнём і мячом па неабходнасці. У 1912-м амерыканцы акупавалі Нікарагуа на 21 год, у 1915-м — Гаіці на 19 гадоў, у 1916-м — Дамінікану на восем, а ў 1965-м яе ж паўторна яшчэ на год. Куба таксама была акупаваная двойчы, не лічачы спробы ваеннай інтэрвенцыі ўжо пры Кастра. У 1983-м было ўварванне ў Грэнаду, у 1989-м — у Панаму, у 1994-м зноў у Гаіці. І толькі ў апошнім выпадку ваенная аперацыя была ўзгоднена Саветам Бяспекі ААН.

Аперацыі ЦРУ супраць суверэнных урадаў Лацінскай Амерыкі падліку наогул не паддаюцца — аб дзейнасці супраць Сальвадора Альендэ ў Чылі ведаюць усе, а пра многіх іншых не ведае ніхто. У гады халоднай вайны Штаты амаль не спасыläліся на «дактрыну Манро», але, па сутнасці, захоўвалі яе прынцыпы: у дзвюх Амерык павінен быць толькі адзін гаспадар, ён жа жандар.

Пры гэтым варта мецъ на ўвазе эксплуатацыю насельніцтва асобных краін з боку амерыканскіх прамыслоўцаў, злачынцаў і прамыслоўцаў-злачынцаў, якая дасягаецца праз карумпаванне эліт (хрэстаматыйны прыклад — рэжым Батысты на Кубе). Так атрымаецца завершаная карціна, у якой каланіяльнае мінулае Лацінскай Амерыкі звязана не толькі на Еўропу як «старога» каланізатара, але і непасрэдна на ЗША як каланізатара новага тыпу, адзначыў vz.ru. Цяпер расклад змяніўся, і выявілася, што больш няма не толькі ўвогуле аднапалярнага свету — няма нават аднапалярнай Амерыкі ў прыватнасці.

### МОМАНТ ІСЦІНЫ

Устрымаўся пры галасаванні на Генеральнай Асамблеі ААН і Пакістан. Паводле інфармацыі выдання The Times, раней паслы 22 краін апублікавалі сумесны ліст, у якім папрасілі Ісламабад падтрымаць рэзалюцыю. Прэм'ер-міністр Пакістана Імран Хан жорстка раскрытыкаваў заходніх дыпламатаў. «Вы што пра нас думаеце? Што мы вашы рабы, якія зробяць усё, што ім скажаш?» — абурыўся палітык. Імран Хан нагадаў: апошні раз, калі Пакістан падтрымаў дзеянні ЗША і НАТА ў Афганістане, па краіне пракацілася хваля гвалту і нездавальнення.

«Калі ЗША не могуць стварыць крызіс, то кампаніі па вытворчасці зброі не могуць працаваць на максімуме. Ім трэба ствараць крызісы, каб забяспечыць інтарэсы гэтай мафіі», — сказаў духоўны лідар і кіраўнік Ірана Алі Хаменеі, паведаміла ТАСС.

Па словах прадстаўніка 5-й сесіі Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў (УСНП, парламент) 13-га склікання Чжана Есуя, Вашынгтон злоўжывае рычагамі ідэалагічнага ўздзеяння для ўзмацнення раз'яднанасці ў свеце. «ЗША ствараюць сваё «кола сяброў», фарміруюць блокі для ўзмацнення супрацьстаяння», — удакладніў ён. Афіцыйны прадстаўнік таксама адзначыў, што такія дзеянні «маральна састарэлі і ні да чаго не прывядуць».

«Кола сяброў» апошнім часам значна звузілася. Адметнай тут падаецца інфармацыя наконт таго, што кіраўнікі дзвюх блізкаўсходніх дзяржаў днямі адмовіліся ад тэлефонных перагавораў з прэзідэнтам ЗША Джо Байдэнам, які хацеў абмеркаваць сітуацыю вакол Украіны і магчымасць нарошчвання нафтаздабычы для зніжэння сусветных цэн на вуглевадароды. Аб гэтым паведаміла амерыканская газета The Wall Street Journal. «Былі чаканні адносна тэлефоннага званка, аднак ён не адбыўся», — прыводзіць выданне словы амерыканскага чыноўніка адносна планаў перагавораў Джо Байдэна з наследным прынцам Саудаўскай Аравіі Мухамедам бен Сальманам Аль Саудам. Паводле яго слоў, размова павінна была пайсці аб павелічэнні аб'ёмаў здабычы нафты з-за росту цэн на энерганосьбіты ва ўмовах санкцый заходніх краін у адносінах да Расіі.



Паводле інфармацыі выдання, аналагічнае рашэнне адмовіцца ад правядзення тэлефонных перагавораў прыняў і спадчынны прынц Абу-Дабі, намеснік галоўнакамандуючага Узброеных сіламі Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў (ААЭ) шэйх Мухамед бен Заід Аль Нахаян. Як адзначае WSJ, пасля таго, як два лідары блізкаўсходніх краін адмовіліся размаўляць з кіраўніком Белага дома, яны на мінулым тыдні правялі тэлефонныя перагаворы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка таксама днямі правёў тэлефонную размову з Мухамедам бен Заідам аль-Нахаянам. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Падчас размовы абмяркоўваліся двухбаковыя адносіны паміж Беларуссю і ААЭ, а таксама сітуацыя ў рэгіёне — у цэнтры Еўропы і ва Украіне.



### ГАЛОН РАЗЛАДУ

«Хто ўвогуле зрабіў ЗША аднаасобным арбітрам у міжнародных адносінах? Што гэта за міжнародны парадак такі, які дазваляе Злучаным Штатам вызначаць, што могуць і што не могуць рабіць іншыя краіны?» — задаецца пытаннем аўтар амерыканскага кансерватыўнага часопіса The American Conservative Род Дрэер. Ён прыходзіць да высновы, што «той новы сусветны парадак, у якім мы жывём, — гэта постамерыканскі сусветны парадак, у якім Злучаныя Штаты з'яўляюцца на сусветнай арэне сілай, якая здзьмулася. Амерыканцам вельмі цяжка змірыцца з думкай, што мы ўжо не тыя, якімі былі раней».

Пакуль Джо Байдэн спрабуе вырашыць праблемы ўнутры краіны і займець давер Штатаў, «якія вагаюцца», Еўропа пачынае сумнявацца ў надзейнасці амерыканскага лідара, піша нямецкая газета Die Welt. «Ці можа 79-гадовы Байдэн, самы стары прэзідэнт у амерыканскай гісторыі, быць лідарам заходняга свету? Ці можа ён абараніць Еўропу?» — задаецца пытаннем аўтар артыкула.

Тым часам цэны на бензін у ЗША працягваюць біць гістарычныя рэкорды, а эксперты прагназуюць працяг росту на паліва. Расійскі тэлежурналіст Валянцін Багданаў перакананы: Амерыка сёння загнала сябе ў вельмі няпростую эканамічную сітуацыю. Аб гэтым эксперт заявіў падчас стрыму на YouTube-канале «Салаўёў LIVE». «Байдэна высмейваюць ужо, вядома, і рэспубліканцы, і СМІ. У свой час, прыйшоўшы да ўлады, Байдэн завярнуў некалькі важных праектаў у нафтавай сферы, разагнаў інфляцыю з дапамогай «верталётных грошай». Усё гэта паўплывала на цэны на нафту, ну і як вынік — Амерыка пры ім стала яшчэ больш залежнай ад экспарту нафты», — зазначыў журналіст.

Валянцін Багданаў нагадаў, што амерыканцы сутаргава паспрабавалі замясціць расійскую нафту венесуэльскай — і атрымалі ад варот паварот. «Наогул лічылася заўсёды, што пяць долараў за галон бензіну — катастрофа для эканомікі Штатаў. Цяпер у Нью-Ёрку ўжо падпаўзае да $5, а на заходнім узбярэжжы — і да 7, 8 і 9 долараў, і ўжо кажуць, што будзе $10. Ну пасля $10 проста вельмі многія амерыканцы паставяць машыны «на прыкол», і вось тут пачнуцца галоўныя праблемы», — падкрэсліў Валянцін Багданаў.

Лагістыка ў Амерыцы такая, што асноўная маса перавозак ажыццяўляецца трэйлерамі, а не чыгункай, якая, да таго ж, не электрыфікавана. «Гэта і так адбываецца на фоне 40-гадовых максімумаў па інфляцыі ў Злучаных Штатах», — канстатаваў Валянцін Багданаў.

### ГАЛОДНЫЯ ГУЛЬНІ

Усё гэта вынік санкцый, якія быццам бумеранг вярнуліся да тых, хто іх «запусціў». Пры гэтым хвалі пайшлі па ўсім свеце. «Ва ўмовах слабага аднаўлення сусветнай эканомікі неабмежаванае ўвядзенне санкцый наносіць шкоду стабільнасці міжнародных вытворчых ланцужкоў, пагаршае харчовы і энергетычны крызісы, а таксама паніжае ўзровень дабрабыту жыхароў усіх краін», — адзначыў міністр замежных спраў Кітая Ван І падчас размовы па відэасувязі са сваім французскім калегам Жан-Івам Ле Дрыянам, паведаміла ТАСС.

